ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 203 (28313)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**PAULINE: «Спяваю для душы́. Але не ў ду́шы»**




**Увага, конкурс!**



**След на сто гадоў наперад**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Цяпер золатавалютныя рэзервы Беларусі складаюць $4,8 млрд. Гэта каля 1,9 месяца імпарту. Калі гаварыць аб тым, якім павінен быць узровень ЗВР з пункту гледжання поўнага забеспячэння ўсіх патэнцыяльных рызык і шокаў, з якімі можа сутыкнуцца краіна, то ён ацэньваецца ў памеры $10-10,5 млрд. Рэалізацыя праграмы з МВФ дасць магчымасць нарасціць узровень рэзерваў да канца 2019 года да $9,5 млрд».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9113 | ▼ |
| Еўра | 2,1018 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0745 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ДЗЕ МЁДАМ НАМАЗАНА?



Верасовы мёд можа стаць брэндам аграгарадка Парэчча ў Гродзенскім раёне. Здабычай гэтага рэдкага віду, нягледзячы на невялікі выхад прадукцыі і працаёмкасць працэсу, займаюцца на прадпрыемстве «Мядовы шлях». Верасовы мёд папулярны ў пакупнікоў з-за сваіх пажыўных і гаючых уласцівасцяў, незвычайнага смаку, колеру і нават дзякуючы вядомай баладзе.
**На здымку:** заатэхнік па пчалярстве Міхаіл СЯМАШКА.

Фота БЕЛТА.

■ Перспектывы

## Будучыня — за інфармацыйнымі біятэхналогіямі



**У савецкія часы наша краіна была зборачным цэхам для ўсяго Саюза. З той эпохі нам засталіся прамысловыя гіганты, якія сёння з'яўляюцца валаўтваральнымі прадпрыемствамі айчыннай эканомікі. Аднак у Беларусі з'яўляюцца і новыя кампаніі, якія змяняюць твар эканомікі. У апошнія гады IT-сектар імкліва расце, як і зарплаты спецыялістаў, што там працуюць. Парк высокіх тэхналогій у 2015 годзе ў параўнанні з папярэднім павялічыў экспарт паслуг на 21% да 705,6 млн долараў. Пры гэтым доля экспарту склала 91,5%. Аднак і на гэтым рынку калісьці ўсталюецца раўнавага, за якой можа наступіць стагнацыя. Доктар эканамічных навук, прафесар, загадчык кафедры менеджменту, тэхналогій бізнесу і ўстойлівага развіцця БДТУ Ірына НОВІКАВА лічыць, што будучыня краіны — за развіццём інавацыйных прадпрыемстваў, якія будуць працаваць у сферы аховы здароўя, біятэхналогій, матэрыялазнаўства, а таксама ў сінтэзе інфармацыйных біятэхналогій.**

***— Як можа змяніцца эканоміка нашай краіны ў бліжэйшы час і на якія сферы варта разлічваць, каб ісці ў нагу з найбольш развітымі краінамі свету?***

— На працягу апошніх дзесяцігоддзяў існуе тэндэнцыя, згодна з якой у развітых краінах на навуковыя даследаванні выдаткоўваюць вялікія сродкі. Напрыклад, ЗША — сусветны лідар па выдатках на навуковыя даследаванні (на гэта выдзяляецца 34%), у краінах Паўднёва-Усходняй Азіі адпаведная лічба каля 30%, у Еўропе — 25%. Нягледзячы на тое, што гэтыя рэгіёны сёння з'яўляюцца наймацнейшымі эканомікамі свету, яны ўсё роўна працягваюць інвеставаць у навуку.

СТАР. 4

■ Сітуацыя

## АДШУКАЦЬ СВАЁ МЕСЦА

### Як у сталіцы вырашаюць праблему парковак




**Аўтамабілісты — сапраўдны біч сучасных мегаполісаў: шматкіламетровыя пробкі, перагружаныя двары, шкодныя выхлапныя газы. Жыхары Мінска, хоць пакуль і не так глабальна, таксама ўжо адчулі на сабе «атаку машын». Асабліва востра стаіць праблема з паркоўкамі: пошук свабоднага месца днём у цэнтры ператвараецца ў складаны квэст. Мы высветлілі, як гарадскія ўлады плануюць вырашыць гэтую «галаваломку», колькі трэба заплаціць за свой камфорт і ці на самай справе «разумныя» аўтаматызаваныя паркоўкі.**

### «Цэнтр горада — не месца для стаянкі машын!»

Каб абмяркоўваць набалелае пытанне аб адсутнасці паркавачных месцаў, для пачатку трэба разабрацца ў паняццях. Паркоўка і стаянка — гэта не сінонімы. Паркоўка прадугледжвае, што аўтамабіліст прыехаў у цэнтр па справах на некалькі гадзін, а вось стаянка — што ён хоча пакінуць машыну на ўвесь працоўны дзень або на ноч. Па словах **дырэктара «Парковак сталіцы» Алега ЛЯШЧЫНСКАГА**, мінчанам пара адвучацца ад шкоднай звычкі кідаць аўтамабіль «дзе прыйдзецца» на 8—10 гадзін. Цэнтр вялікага горада проста не здольны вытрымаць такую нагрузку. Адсюль і праблемы з часовымі паркоўкамі, якія пастаянна занятыя «стаўшымі на якар» аўтамабілямі. У многіх краінах абмежаваны альбо поўнасцю забаронены ўезд у цэнтр буйнога горада на ўласным аўтамабілі, альбо за такое задавальненне даводзіцца выкласці «кругленькую» суму. Такія правілы дзейнічаюць і ў суседняй Расіі: напрыклад, у Маскве кожная наступная гадзіна паркоўкі ў цэнтры каштуе даражэй, чым папярэдняя, маўляў, будзьце шустрымі. У нас пакуль усё наадварот, і на шматлікіх паркоўках за першую гадзіну прыйдзецца выкласці больш буйную суму — парадку 1 рубля, чым за астатнія.

СТАР. 3

# УЛІЧВАЦЬ СУЧАСНЫЯ РЭАЛІІ

**Сістэму падрыхтоўкі ваенных кадраў у Беларусі неабходна ўдасканальваць. Такое даручэнне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў у час праверкі ўзроўню прафесійна-службовай падрыхтоўкі афіцэрскага складу Узброеных Сіл на 230-м агульнавайсковым Абуз-Лясноўскім палігоне, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Не стану аспрэчваць, што гэта сістэма існуе, але тое, што мы яе даўно не ўзварушвалі і не прыстасавалі да сучаснай вайны, гэта факт. Ёсць у нас праблемы і з тэрмінамі навучання, з праграмамі і выкладчыкамі, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Трэба браць выкладчыкамі падрыхтаваных людзей з часцей, каб яны маглі вучыць таму, што трэба на вайне».

Прэзідэнт падкрэсліў, што падрыхтоўку ваенных кадраў трэба пастаянна прыстасоўваць да сучасных рэалій. Гэта датычыцца не толькі ваенных і ваенізаваных вышэйшых навучальных устаноў, але і ваенных факультэтаў у грамадзянскіх ВНУ. «Трэба ў дзяржсакратарыяце стварыць групу спецыялістаў і ўсё прааналізаваць, вычысціць з праграм непатрэбнае, зрабіць адэкватнымі тэрміны навучання, паглядзець на завочную форму навучання: ці патрэбна яна нам. Афіцэры ж крытыкуюць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што мае патрэбу ў дапрацоўцы і сістэма праверкі ўзроўню падрыхтоўкі афіцэраў. «Самае страшнае — гэта фармалізм, не паўтарыць бы нам тое, што было ў савецкія часы, — сказаў Прэзідэнт. — Рабіце так, каб афіцэра можна было праверыць. Я не гавару, што яны павінны быць у вас вундэркіндамі, але я сам бегаў, падцягваўся і займаўся з салдатамі. Таму ведаю, які павінен быць афіцэр. Зрабіце яго такім».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Калі мы самі сябе будзем уводзіць у зман, гэта недапушчальна. Мы не тая краіна, дзе можна на нешта махнуць рукой, падняць верталёт, паказаць агонь — гэта зусім не галоўнае. Галоўнае, каб афіцэр мог навучыць свайго падначаленага».

Тут жа, на Абуз-Лясноўскім палігоне, Прэзідэнту прадэманстравалі два новых сучасных верталёты Мі-8МТВ5-1. Ва Узброеныя Сілы краіны зусім нядаўна з Казанскага верталётнага завода паступіла шэсць сучасных верталётаў Мі-8 гэтай мадыфікацыі. Чакаецца, што ў беларускую армію паступяць яшчэ шэсць такіх лятальных апаратаў.

Адзін з верталётаў, прадэманстраваных Прэзідэнту, мае пошукава-выратавальнае прызначэнне, другі — транспартнабаявы. За доўгія гады эксплуатацыі верталёт Мі-8 прызнаны адным з лепшых у свеце ў сваёй катэгорыі.

**Міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ** далажыў кіраўніку дзяржавы, што беларускія вайскоўцы, выступаючы на міжнародных спаборніцтвах, не саступаюць па прафесіяналізму арміям буйных краін. У час даклада размова зайшла пра выступленне беларускіх ваенных на спаборніцтвах «Танкавы біятлон», якія адбыліся на падмаскоўным палігоне ў жніўні. Было адзначана, што нашы вайскоўцы па выніках турніру заваявалі некалькі ўзнагарод, разам з тым іх выступленне на некаторых этапах магло быць больш паспяховым.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што беларуская каманда падчас заездаў саступала па хуткасці і не змагла абыйсці расійскі экіпаж. Андрэй Раўкоў растлумачыў, што гэта звязана з тым, што танкі, на якіх удзельнічалі беларусы, былі не такія магутныя. Аднак ужо прынята рашэнне іх мадэрнізаваць, каб у наступным годзе мы змаглі паказаць лепшыя вынікі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на такіх буйных спаборніцтвах неабходна выйграваць, бо ад гэтага, у тым ліку, залежыць імідж беларускай арміі. «Туды збіраецца ўся ваенная, і нават не толькі ваенная, эліта», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы маем лепшы вынік па стральбе, але па хуткасці трошкі прайграем: магутнасць рухавікоў у нашых танкаў 840 к.с., а ў расіян — 1130. Але нават у гэтых умовах нашы вайскоўцы ў шэрагу заездаў абганялі расіян, — сказаў міністр. — Па прафесіяналізму мы з сусветнымі арміямі спаборнічалі нароўні, а па некаторых пазіцыях нават пераўзыходзілі».

Андрэй Раўкоў таксама лічыць, што некалькі ваенных конкурсаў можна праводзіць і ў Беларусі, умовы і магчымасці для гэтага ёсць. Прэзідэнт падтрымаў гэтую прапанову і адзначыў: «Гэта добрая падрыхтоўка і трэніроўка, там не прыпішаш і не дабавіш».

■ Крэдыт

# ГРОШЫ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ

**Крэдыт МВФ для Беларусі, які можа перавышаць $3 млрд, — самы танны з усіх магчымых да прыцягнення сродкаў, заявіў учора журналістам першы намеснік міністра фінансаў Максім Ермаловіч, паведамляе БЕЛТА.**

«І гэта не толькі крэдыт МВФ. Да гэтага пакета прыкладаецца цэлы комплекс дадатковых інструментаў. Гэта і пазыка Сусветнага банка на мэты развіцця. Памер гэтай пазыкі залежыць ад пакета структурных пераўтварэнняў, закладзеных у сумесную з МВФ праграму, і складае каля $200—300 млн. Гэтыя грошы ідуць непасрэдна ў бюджэт на рэалізацыю тых ці іншых сацыяльных і эканамічных мер», — адзначыў Максім Ермаловіч.

Таксама не выключана магчымасць прыцягнення рэсурсаў Еўрапейскага саюза, ён традыцыйна суправаджае праграмы МВФ сваімі крэдытнымі рэсурсамі. Такая макрафінансавая дапамога ЕС можа складаць да $500 млн на перыяд рэалізацыі праграмы ■

■ Стасункі

# З разлікам на паляпшэнне

## ЗША прыпынілі санкцыі ў дачыненні да дзевяці нашых прадпрыемстваў

**Карныя меры ў дачыненні да іх прыпынены на 6 месяцаў — да 30 красавіка 2017 года. Прэс-служба Міністэрства замежных спраў нашай краіны ўчора абнародавала на сваім сайце каментарый, у якім гаворыцца, што МЗС вітае такое рашэнне амерыканскага боку.**

«Пры гэтым мы застаёмся перакананымі ў тым, што поўная адмена існуючых санкцый ЗША самым спрыяльным чынам садзейнічала б больш дынамічнаму развіццю беларуска-амерыканскіх адносін», — гаворыцца далей у каментарыі прэс-службы.

На гэтым тыдні ў нашай краіне знаходзіцца **намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША Брыджыт БРЫНК**. Яна ўжо сустрэлася з прадстаўнікамі некалькіх ведамстваў, у тым ліку з Уладзімірам Макеем, міністрам замежных спраў. Як заявіла Брыджыт Брынк падчас сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ, у Дзяржаўным дэпартаменце ЗША разлічваюць на далейшае паляпшэнне стасункаў з Беларуссю.

«Я і мае калегі спадзяёмся, што тое паляпшэнне адносін, якое мела месца ў апошнія 13—14 месяцаў, працягнецца. Ёсць шмат аспектаў у двухбаковых адносінах, якія маюць для нас вялікую важнасць. Мы заўсёды будзем лічыць галоўнымі з іх правы чалавека і дэмакратыю», — сказала намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША. Па словах Брыджыт Брынк, ЗША разлічваюць, што нармалізацыя адносін з Беларуссю адбудзецца. «Гэта тычыцца і пытання абмену пасламі. Але гэта паступовы працэс, — прызнала яна. — Бакі падзяляюць погляд пра неабходнасць нармалізацыі і паляпшэння адносін паміж краінамі».

Гаворачы аб парламенцкай выбарчай кампаніі ў нашай краіне, Брыджыт Брынк канстатавала, што ў ЗША вітаюць мірны характар правядзення выбараў, адзначаючы пэўны прагрэс. Разам з тым яна лічыць важнай далейшую работу па рэалізацыі рэкамендацый АБСЕ па ўдасканаленні выбарчага працэсу.

**Даведка «Звязды»**

Санкцыі ЗША ў дачыненні да прадпрыемстваў нашай краіны ўвёў у 2006 годзе колішні прэзідэнт Злучаных Штатаў Джордж Буш, з таго часу яны дзейнічалі аж да канца мінулага года. У санкцыйны спіс уваходзяць: «Беларускі нафтавы гандлёвы дом», канцэрн «Белнафтахім», Belneftekhim USA Inc., «Белшына», «Гродна Азот», «Гродна Хімвалакно», «Лакафарба», «Нафтан» і «Полацк-Шклавалакно».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

■ Нас пачулі

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

## Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, як улады рэагуюць на зварот жыхароў у газету

**Праблемы ў жыцці прыватнага сектара на Падгорнай у Магілёве некалькі месяцаў таму сталі тэмай для крытычнай публікацыі ў «Звяздзе» («SOS з Падгорнай», 10 жніўня 2016 года). Жыхары даслалі скаргу з-за паўразбуранага ліўневага калектара, хліпкага мастка цераз раку Дзебру, ненадзейных умацаванняў сцвавольнай рачулкі і шмат чаго іншага. Усе гэтыя няшчасці зваліліся на іх не раптоўна, некаторыя не вырашаліся гадамі. Публікацыя не засталася без увагі з боку ўлад. Нядаўна мы разам са старшынёй вулічкама прайшліся па знаёмых мясцінах, паглядзелі, што было зроблена, а да чаго яшчэ рукі не дайшлі.**


Аляксандр Васілевіч запрашае Тамару Іванаўну прайсціся па мастку.

### Калектару прыбудавалі латок

Аляксандр Пікуля першым чынам вядзе да ліўневага калектара, пра крытычны стан якога прасігналізавалі жыхары некалькі месяцаў таму. Пасля моцных дажджоў ён пачаў разбурацца, а пешаходная сцежка спаўзаць у яму. Старшыня вулічкама абураўся, што ніхто на звароты жыхароў не рэагуе, а сітуацыя з кожным днём пагаршаецца. Публікацыя ў «Звяздзе» суправаджалася каментарыямі адказных асоб. Яны абяцалі прыняць меры, і сапраўды хутка адрэагавалі. Аляксандр Пікуля кажа, што тэхніка Дарожна-маставога прадпрыемства (ДМП) была на месцы ўжо праз тыдзень. Вось толькі ёсць заўвагі да якасці гэтых работ.

З аднаго боку, праблема вырашана: выразаны хмызняк, пакладзены бетонны латок, зроблена спецыяльная сценка, каб вада не размывала сцежку. Але той самы зрэзаны хмызняк не вывезены, валяецца за метр ад сцежкі, насупраць яго ляжыць нікому не патрэбны кавалак трубы, ніжэй, дзе з латка сцякае вада, сабралася смецце. Пікуля сведчыць, што стаміўся нагадваць камунальнікам, каб усё прывялі ў належны выгляд. «Зусім сорам страцілі, я ж іх папярэджваў, што прывяду карэспандэнта, — злуецца ён і дастае мабільны тэлефон. — Трэба паставіць перад фактам камунальную службу». Старшыня вулічкама настроены па-баявому. Ён не любіць безгаспадарчасці і нікому не дае спуску. «ДМП працуе праз пень-калоду, — абураецца ён. — Нейк рамантавалі ў нас на Падгорнай драўляную лесвіцу. Новую зрабілі, а зламаную старую пад ёй схавалі».

Па сцяжынцы да нас накіроўваецца жанчына. Знаёмімся. Любоў Касценіч жыве на вуліцы Грышына, а гэтай дарогай ходзіць да сына на Падгорную. Праблему, як той казаў, ведае знутры.

— Нават страшна ўспамінаць, як было, — кажа яна. — Усё абвальвалася, разбуралася. Прайсці было немагчыма. Зараз хоць не страшна хадзіць. Але адразу бачна, што рабілі справу як не для сябе. Вунь колькі смецця пакінулі.

### Масток цяпер з парэнчамі

Аляксандр Пікуля паклапаціўся зрабіць 140 (!) копій старонкі «Звязды» з SOS-публікацыяй. Развесіў іх на ўсіх прыпынках і ў магазіне. І зараз, калі мы ідзем з ім па мікрараёне, ён кожны раз звяртае ўвагу на тое, што побач з ім — карэспандэнт «Звязды». Людзі ўсміхаюцца і дзякуюць. Дробязь, а прыемна.

Аляксандр Васілевіч узгадвае, як 10 год таму «Звязда» дапамагала зрабіць на Падгорнай дарогу.

— З-за яе адсутнасці аўтобус не хадзіў і людзі былі вельмі незадаволены, — расказвае ён. — Мы сабралі сход і запрасілі прадстаўнікоў гарвыканкама, камунальнікаў, дэпутатаў. Ніхто не прыйшоў. І мы з жыхарамі падрыхтавалі ліст у газету «Звязда». Адрас падказала адна жанчына, якой газета дапамагла з асабістым пытаннем. Толькі пасля гэтага справа зрушылася з месца.

Не засталася газета ўбаку і на гэты раз. Дапамагла не толькі з калектарам. Прымаюцца меры і па замене пешаходнага мастка цераз Дзебру насупраць дзіцячага садка № 39. Зараз на ім усталяваны парэнчы. Але мост ужо аджыў сваё, на ім дзіркі, увесь хістаецца. Пікуля спадзяецца, што недахопы хутка выправяць. Ён ужо пабываў у дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва і заручыўся абяцаннем, што драўляны мост зменяць на бетонны. Неабходная для гэтага пліта ўжо ляжыць побач. Засталося яе ўстанавіць і прымацаваць больш сур'ёзныя парэнчы. Пакуль мы абмяркоўваем, калі гэта адбудзецца, да нас далучаецца жыхарка, якой таксама цікавы лёс мастка: яна карыстаецца ім пастаянна.

### Прыклад для дэпутатаў

На жаль, пакуль няма ніякіх зрухаў па добраўпарадкаванні самой Дзебры і непрацуючых ліхтароў. Пікуля збіраецца пісаць ліст у КДК у Мінск. Час ідзе, а абяцанні застаюцца толькі на паперы. Тое, што жыхары Падгорнай масава яго падтрымаюць, можна не сумнявацца. Ён тут карыстаецца бясспрэчным аўтарытэтам.

Людзі прыветліва махаюць яму, падыходзяць падзякаваць або спытаць нешта.

З якім пытаннем да яго ні звярніся — усе вырашае. На 9-м Падгорным завулку зараснікі кустоў толькі дзякуючы яму прыбралі, — кажа тутэйшы жыхар Віктар Аляксандравіч.

**Аляксандр Пікуля паклапаціўся зрабіць 140 (!) копій старонкі «Звязды» з SOS-публікацыяй. Развесіў іх на ўсіх прыпынках і ў магазіне.**

— Лепшага старшыні вулічкама не знойдзеш, — падтрымлівае яго Мікалай Міхайлавіч. — Ён у нас тут парадак навёў. На веласіпедзе аб'язджае ўсю тэрыторыю, глядзіць дзе што не так.

Зараз Пікуля заклапочаны тым, каб асфальт паклалі на вуліцы Ламаносава, замянілі лямпачкі ў завулку Бетховена... Гэты працэс, на жаль, беспярапынны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by* ■

# Прыярытэт — занятасць насельніцтва

**Адна з галоўных задач кіраўнікоў усіх узроўняў заключаецца ў забеспячэнні занятасці насельніцтва, заявіла ў час сустрэчы з працоўным калектывам Добрушскага фарфоравага завода намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Прыярытэтам для кіраўнікоў усіх узроўняў павінна быць работа па стварэнні новых працоўных месцаў», — лічыць Наталля Качанава. Гэта аснова асноў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, падкрэсліла віцэ-прэм'ер.

Наталля Качанава адзначыла, што на 1 верасня ў Беларусі створана больш за 35 тыс. новых працоўных месцаў (гадавы план — 50 тыс.). У краіне зарэгістравана 42,6 тыс. беспрацоўных, колькасць прапанаваных вакансій складае 37 тыс.

«Прымаемыя ўрадам меры па садзейнічанні занятасці насельніцтва даюць бачны вынік», — падкрэсліла яна. Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу, што ўстановам сацыяльнай сферы варта надаваць больш увагі рабоце па прыцягненню пазабюджэтных сродкаў, што дасць магчымасць павысіць зарплаты. Яна расказала аб рабоце па ўдасканаленні сфер адукацыі і аховы здароўя краіны, закранула пытанні культуры і спорту.

Пасля сустрэчы з працоўным калектывам Добрушскага фарфоравага завода Наталля Качанава правяла прыём грамадзян па асабістых пытаннях. Віцэ-прэм'ер таксама азнаёмілася з работай прадпрыемства, была праінфармаваная аб сацыяльна-эканамічным развіцці Добрушскага раёна.

# СОНЦА ШЧЫРАЕ І АДКРЫТАЕ

## Беларуская старонка прытуліла, сагрэла і дала крылы для творчага палёту пісьменніку Ганаду Чарказяну

Заўсёды з цікавасцю адкрываю кнігі Ганада Чарказяна, якія ўжо некалькі дзесяцігоддзяў запар на рускай і беларускай мовах выдаюцца ў Мінску. Заўсёды з добрым настроем адкрываю для сябе старонкі з яго публікацыямі ў перыядычным друку. І асабліва радуюся, калі бачу, што творы курда па нацыянальнасці, які нарадзіўся ў Арменіі, выдаюцца, ідуць да чытача на беларускай... Разумею, што гэта важна для літаратара, які пачаў свой шлях з напісання вершаў і апавяданняў па-армянску і па-курдску. Ён і зараз — у стыхіі роднага, таго, што выпеставана з малаком маці. Таго, што прыйшло да яго ад родных прастораў армянскай старонкі, ад ваколіц роднага паселішча. Але ж, відавочна, родным з'яўляецца для яго і наша беларуская прастора. Нашы рэкі і азёры, нашы лясы, дзе Ганад блукае ў грыбным паляванні, і нашы палеткі, якія дораць пісьменніку васільковыя фарбы. Таму, пэўна, так лёгка чытаецца адзін з яго раманаў, падзеі якога адбываюцца на Міншчыне, а калі і ў іншай старонцы — то яны звязаныя з Беларуссю, беларускімі лёсамі. Як і ў выпадку з біяграфіяй салдата-«афганца», які патрапіў у палон да душманаў, прайшоў праз многія выпрабаванні, але захаваў сябе, спакутаванага душой, сэрцам, як асобу, захаваў свой родны свет.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Ганада ЧАРКАЗЯНА віншуе Каміль КАМАЛ.

У кнігах Ганада Чарказяна — шмат святла сонечнага, шмат колераў і фарбаў, што адлюстроўваюць цеплыню, прыязнасць, ласку і спагаду. Добрай душы чалавек піша такія творы... Менавіта гэтая высНова гучала і на вечарыне ў гонар 70-годдзя Ганада Чарказяна, якая адбылася ў Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Калегі па пяру, сябры Ганада Чарказяна, музейшчыкі сказалі шмат добрых слоў у дачыненні да чалавека з нераўнадушнай творчай душою.

А мне падумалася, што Ганад Чарказян — на дзіва шчаслівы пісьменнік. Талент яго ў свой час быў заўважаны народным паэтам Беларусі Петрусём Броўкам. Ён напісаў і прадмову да першага вершаванага зборніка маладога паэта. Ганад Барыевіч сябраваў з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым, паэтам і празаікам Алегам Лойкам, народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным... Дарэчы, творца шмат рупіцца аб захаванні памяці пра аўтара верша «Трэба дома бываць часцей...», ушацкага па нараджэнню песняра. «Вельмі хацелася б, каб дом Рыгора Іванавіча ва Ушачах, — гаворыць Ганад Чарказян, — стаў сапраўдным музеем. Каб туды ішлі ўсе прыхільнікі таленту вялікага паэта... Я ўдзячны Рыгору Барадуліну за многія гады творчага сяброўства, за яго перакладчыцкія памкненні ў дачыненні да маіх паэзіі і прозы... Мо нават жанр кароткага верша — чаргаві — нарадзіўся ў мяне дзякуючы стасункам з Рыгорам Іванавічам...»

Нельга не нагадаць, што шмат Ганадам Чарказянам зроблена і ў галіне дзіцячай літаратуры. Творы, адрасаваныя юнаму чытачу, таксама выдадзены на дзвюх мовах — рускай і беларускай. Застаецца пажадаць пісьменніку творчага плёну, ды яшчэ моцнага здароўя дзеля здзяйснення задумак, памкненняў і мар.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

## ■ Ну і ну!

## ПАЦЯРПЕЛІ З-ЗА... МАНЕТ

**Учора раніцай у самым цэнтры сталіцы адбылася сур'ёзная аварыя.**

На праспекце Незалежнасці, непадалёк ад плошчы Якуба Коласа, сутыкнуліся дзве маршруткі, якія ехалі з боку вуліцы Казлова. Мікрааўтобус "Мерседэс" ззаду ўрэзаўся ў стаячы «Форд».

На месца дарожна-транспартнага здарэння прыбыла брыгада хуткай дапамогі, некалькім пасажырам абодвух аўтамабіляў спатрэбілася дапамога медыкаў. У асноўным пацярпелыя атрымалі ўдары і сінякі.

Як расказала **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе Дзяржаўтаінспекцыі Савецкага раёна сталіцы Марыя ДЗЬЯКАВА**, прычынай аварыі, паводле слоў кіроўцы «Мерседэса», сталі... манеты. Падчас паездкі на падлогу салона рассыпалася дробязь, якой пасажыры расплачваліся за праезд. Мужчына нахіліўся, каб яе падняць, і не ўсачыў за дарожным рухам.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# Мінск у цэнтры ўвагі

## У сталіцы праходзіць 45-я Генеральная асамблея Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў

**Права прыняць прэстыжны кантынентальны форум Беларусь атрымала на Генеральнай асамблеі-2015 у Празе, з таго часу і пачалася старанная падрыхтоўка да найбуйнейшай падзеі спартыўнага календара восені. Гэтымі днямі ў Мінск прыбудуць прадстаўнікі ўсяго алімпійскага руху, лідары кантынентальных асацыяцый МАК, прадстаўнікі міжнародных спартыўных федэрацый. Свой удзел у мерапрыемствах пацвердзілі прадстаўнікі ўсіх 50 еўрапейскіх НАКаў.**

— Беларусь еўрапейскай алімпійскай супольнасцю ўспрымаецца як краіна, якая любіць і паважае спорт, валодае дастатковымі рэсурсамі для правядзення такіх буйных форумаў, — адзначае **першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максім РЫЖАНКОЎ.** — У ходзе работы Генеральнай асамблеі ўдзельнікі і госці азнаёмяцца са спартыўнымі аб'ектамі, турыстычным патэнцыялам і развіцтой сістэмай гатэляў у Мінску. Упэўнены, гэта дазволіць у будучыні беларускаму боку, нашым федэрацыям па відах спорту прэтэндаваць на правядзенне самых буйных міжнародных падзей, — дадаў ён.

Акрамя таго, беларускі бок на Генасамблеі выступіць з шэрагам ініцыятыў. У прыватнасці, будзе агучана самае актуальнае пытанне сусветнага спорту — барацьба з ужываннем забароненых прэпаратаў.

Таксама Беларусь цікавіць пытанне рэалізацыі праграм па лініі МАК па падтрымцы дзіцяча-юнацкага спорту і атлетаў, якія завяршаюць сваю спартыўную кар'еру.

Рабочая група па падрыхтоўцы 45-й Генеральнай асамблеі ЕАК знаходзіцца ў Мінску ўжо некалькі дзён, генеральны сакратар Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Рафаэле Паньёці паспеў бліжэй пазнаёміцца з нашай краінай.

— У наступныя тры дні ў Мінску пройдзе шэраг неардынарных падзей, будуць абмеркаваны важныя пытанні развіцця алімпійскага руху. Таксама асаблівая ўвага будзе ўдзелена святкаванню 25-годдзя Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Для нашай вялікай сям'і алімпійскага руху вялікае шчасце, што кіраўнік беларускай дзяржавы з'яўляецца таксама і прэзідэнтам НАК. Гэта дазваляе развівацца спорту ў Беларусі вельмі хутка. Важна, што ёсць прагрэс у выніках на міжнароднай арэне. Упэўнены, пасля правядзення Генасамблеі аўтарытэт вашай краіны ў спартыўным свеце яшчэ больш вырасце, — зазначыў Паньёці.

Асноўныя ж мерапрыемствы пройдуць у штаб-кватэры НАК Беларусі ў Зале алімпійскай славы 21-22 кастрычніка. Гэтак жа падчас работы асамблеі ў Мінску адбудзецца ўручэнне прэміі імя Пятра Нуроўскага «Лепшы еўрапейскі малады спартсмен», сярод прэтэндэнтаў на яе атрымання ёсць і прадстаўнік Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# АДШУКАЦЬ СВАЁ МЕСЦА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Зараз месцаў катастрафічна не хапае, аднак праблема ўжо вырашаецца. На дадзены момант у сталіцы ёсць 1700 платных машынамесцаў. Да канца 2017 года плануецца павялічыць іх колькасць да 10 тысяч у межах 2-га транспартнага кальца. Як расказаў Алег Ляшчынскі, развіццё сеткі паркавак разлічана на пяць этапаў: кожны квартал будуць уводзіцца ў строй па 2 тысячы паркавачных месцаў. Першы этап, які павінен завяршыцца да канца гэтага года (а гэта яшчэ 300 месцаў), прадугледжвае ахоп тэрыторыі ў межах пр. Незалежнасці — вул. Свярдлова — вул. Кірава — вул. Энгельса. Далей па плане — вуліцы Камсамольская — Інтэрнацыянальная — Рэвалюцыйная — гэты ўчастак ужо практычна гатовы, наступныя этапы — стварэнне камфортных умоў для аўтамабілістаў у раёне Нямігі, плошчы Якуба Коласа і 2-га транспартнага кальца.

Што датычыцца павышэння платы за паслугу, то гэтае пытанне зараз абмяркоўваецца. Аднак калі змены і будуць, то яны закрануць толькі пэўныя зоны. У прыватнасці, найбольш загружаную тэрыторыю ў цэнтры — Верхні горад. Цяпер кошт паркоўкі тут 2 рублі за гадзіну, аднак сума можа вырасці да 5 рублёў. Усе новыя паркоўкі аўтаматызаваныя: расплаціцца можна шасцю рознымі спосабамі. Як адзначыў Алег Ляшчынскі, найбольш часта выкарыстоўваюць для гэтага мабільны тэлефон: СМС ці USD-запыты. Аднак і з наяўнымі грашыма не павінна ўзнікнуць праблем: паркаматы прымаюць і купюры, і манеты, а таксама даюць рэшту. Але адсутнасць чалавечага кантролю многім не ідзе на карысць: добрасумленна аплачваюць паркоўкі ўсяго 40% карыстальнікаў. Зараз наладжваецца механізм пакарання несвядомых грамадзян, і задарма скарыстацца паслугай больш не атрымаецца.

## Стаянкі на ўскраінах і паркінг-вундэркінд

Як жа быць тым, хто не можа адмовіць сабе ў задавальненні або ў неабходнасці ездзіць на працу на ўласным транспарце? Калі не пашанцавала са службовай паркоўкай, то выхадаў ёсць некалькі: перахопліваючыя стаянкі і платныя паркінгі. Асноўнае прызначэнне перахопліваючых стаянак у тым, каб аўтаўладальнік мог пакінуць сваю машыну каля адной з крайніх станцый метро, а далей працягнуў шлях на грамадскім транспарце. Аднак прапанаваныя варыянты большасць гараджан не задавальняюць, бо да метро яшчэ трэба пад'язджаць або доўга ісці, а гэта ўжо занадта складаная схема.

Калі гаварыць пра другі варыянт, то, магчыма, сітуацыя тут кардынальным чынам хутка зменіцца. У пачатку наступнага тыдня ў цэнтры сталіцы пачне працу самы буйны ў Беларусі паркінг. Акрамя ўнушальных памераў, ён будзе валодаць яшчэ адной не менш уражлівай характарыстыкай: практычна ўсе працэсы ў ім будуць аўтаматызаваны, таму ўжо цяпер за ім замацавалася слава першага «разумнага» паркінга ў краіне. Удзел дыспетчара больш не спатрэбіцца, каб адрэгуляваць асвятленне: у залежнасці ад надвор'я і часу сутак камп'ютар сам абярэ патрэбны ўзровень. Гэта ж адносіцца і да вентыляцыі памяшкання: як толькі падвысіцца канцэнтрацыя вугляkіслага газу, «мазгавы цэнтр» паркоўкі запусціць сістэму ачышчэння паветра.



Незвычайным можа здацца і сам вонкавы выгляд паркінга. Ён пабудаваны ў фармаце «open spase», гэта значыць да неабходнага мінімуму зведзена колькасць апорных калон: яны знаходзяцца на адлегласці 17 метраў адна ад адной, што значна паляпшае агляд і працэс паркоўкі. Такую нестандартную для Беларусі канцэпцыю распрацаваў адзін з вядучых экспертаў у гэтай сферы нямецкі праекціроўшчык Ілья Ірмшэр.

На пяці ўзроўнях агульнай плошчай у 27 тысяч $м^2$ зможа размясціцца каля тысячы машын. Паколькі новы паркінг знаходзіцца ў раёне Нямігі, мяркуецца, што ён дапаможа істотна разгрузіць цэнтр горада. Прыемная навіна для аўтамабілістаў: да канца снежня шматузроўневая стаянка будзе працаваць у тэставым рэжыме, таму скарыстацца паслугай можна будзе бясплатна.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

***На сайце zviazda.by можна паглядзець відэа апытання карыстальнікаў сталічных паркоў.***

■ Фінансы

# ІНФЛЯЦЫЮ НЕ ПУСЦЯЦЬ ЗА 12%

## Акрамя таго, сёлета банкіры абяцаюць нам стабільны курс рубля



**Нацыянальны фінансавы рэгулятар упэўнены ў захаванні інфляцыі на прагнозным узроўні да канца года, паведаміў учора старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел КАЛАУР на XIII Міжнародным форуме па банкаўскіх інфармацыйных тэхналогіях «БанкIТ'2016».**

Ён адзначыў, што «эканоміка краіны абавязкова вытрымае і інфляцыя па выніках года будзе не больш за 12%». Паводле слоў старшыні праўлення, пры разліку прагнозных паказчыкаў на наступны год улічвалася шмат фактараў. «У аснове, вядома, ляжаць пытанні макраэканамічнай збалансаванасці. Наступны фактар — інфляцыйныя і дэвальвацыйныя чаканні, заснаваныя на даверы да эканамічнай палітыкі. Такія чаканні сёння мінімальныя. Вядома, прымаўся да ўвагі і фактар магчымага росту рэгуляваных цэн па тарыфах на жыллёва-камунальныя паслугі», — сказаў Павел Калаур.

### Шоку не будзе

Таксама эксперты Нацбанка не чакаюць у найбліжэйшыя месяцы істотнай змены абменнага курсу беларускага рубля. «Сёння мы маем рынкавы курс. Тэндэнцый, якія б негатыўна ўздзейнічалі на плацежны баланс краіны, няма. Спецыялісты не чакаюць нейкіх шокаў да канца года, якія б зрабілі ўплыў на дынаміку абменнага курсу беларускага рубля», — адзначыў кіраўнік Нацбанка. Ён падкрэсліў, што сцэнарны падыход да прагназавання дазваляе ўлічваць магчымыя рызыкі і ўзрушэнні. «Калі мы прагназуем тыя ці іншыя працэсы да канца года, мы ўлічваем і перамоўны працэс з Расіяй па газе, і перспектыўнае супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі. Таму тое, што мы разам з урадам ацэньвалі да канца года і прагназавалі на наступны год, гэта — ужо з улікам рызык, якія могуць матэрыялізавацца», — растлумачыў ён.

### Праблемныя актывы пачнуць зніжаць налета

Павел Калаур упэўнены, што меры, якія рэалізуе Нацбанк разам з урадам і банкаўскай супольнасцю, дазволяць ужо ў наступным годзе зніжаць узровень праблемных актываў банкаў. Але для гэтага трэба будзе сур'ёзна папрацаваць. Таму ўжо цяпер урад і Нацбанк праводзяць ацэнку, у тым ліку незалежную, рэальнага сектара эканомікі. «Ключ да вырашэння праблемы — гэта аздараўленне прадпрыемстваў, паляпшэнне іх фінансавага стану», — лічыць старшыня праўлення Нацбанка.

Пры гэтым Павел Калаур падкрэсліў, што сітуацыя ў банкаўскай сістэме прагназаваная і кіраваная. «Стрэс-тэсты, якія мы рабілі з удзелам міжнародных арганізацый, незалежная ацэнка аўдытарскіх кампаній і ацэнка ў рамках патэнцыйнага нагляду Нацыянальнага банка дазваляюць рабіць пэўныя высновы з пункту гледжання не толькі колькаснага стану праблемных актываў, але і з пункту гледжання наступных тэндэнцый. Паводле нашых ацэнак, той узровень праблемных актываў, які на сённяшні дзень склаўся, да канца года істотным чынам мяняцца не будзе. Да канца года магчымы рост долі праблемных актываў не павінен перасягнуць узровень 16%. Цяпер доля такіх актываў складае 14,8%», — сказаў ён.

### Палова — ужо за «пластыкам»

Кіраўнік Нацбанка адзначыў на форуме і ўпэўненае развіццё адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (АРІП), дзе доля безнаяўных плацяжоў складае 52%. Больш таго, у гэтай сістэме цяпер фіксуецца аднназначны трэнд на іх павелічэнне, як і на павелічэнне колькасці ўдзельнікаў. «Тут самае галоўнае, што ёсць магчымасць аказання насельніцтву якасных паслуг па нізкай цане», — адзначыў Павел Калаур. Ён паведаміў, што задача па павелічэнні долі безнаяўных разлікаў у цэлым у Беларусі вырашана. «Безумоўна, лічба ў 50%, якая вызначалася, была арыенціровачнай, я б сказаў, яна была мабілізуючай. Мы не вызначаем зараз нейкіх канкрэтных лічбаў па долі безнаяўных разлікаў на будучыню, — растлумачыў Павел Калаур. — Для нас прынцыпова важна закласці падыходы, асновы, якія б дазволілі натуральным чынам рухацца па шляху трансфармацыі грашовай сістэмы з выкарыстаннем самых сучасных тэхналогій».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Будучыня — за інфармацыйнымі біятэхналогіямі

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

А што тычыцца Цэнтральнай Азіі, то тут на навуковыя пошукі выдзяляюць усяго 2,6% з агульнасусветных выдаткаў на навуку. У перыяд пераходу да шостага тэхналагічнага ўкладу выйсці на новы эканамічны ўзровень нашай краіне не дапаможа вытворчасць трактароў ці грузавых машын. У гэтых сектарах рынкі ўжо падзелены. Увесь свет, у тым ліку і Беларусь, неўзабаве пераходзіць у эпоху постіндустрыяльнай эканомікі. Найбольш тэхналагічна развітыя краіны да яе ўжо практычна перайшлі.

Відавочным паказчыкам гэтага з'яўляецца той факт, што ў макраструктуры іх ВУП пераважае сфера паслуг. У ЗША і ў некаторых краінах Вялікай сямёркі яна ўжо дасягае 70—80% у структуры валавога прадукту. Аднак дагэтуль існуе стэрэатып, што пад сферамі паслуг маецца на ўвазе толькі будаўніцтва або стрыжка ў цырульні. Гэта частка сферы паслуг, аднак яна займае толькі мікраскапічную долю. Асновай сектара паслуг, які можа стаць адным з ключавых для нашай краіны параўнальна хутка, будзе з'яўляцца навука, навуковае абслугоўванне, адукацыя, фінансавыя паслугі, кансалтынг, лагістыка, сувязь.

***— Ці ёсць ужо ў Беларусі тыя навуковыя напрамкі, якія здольны аказаць станоўчы эфект на нашу эканоміку ў будучыні?***

— Кажучы аб навуковых напрамках у нашай краіне, можна ўжо сёння вылучыць шэраг тых паслуг, якія змогуць вывесці эканоміку на новы ўзровень. Па разліках экспертаў да нас прыходзіць шосты тэхналагічны ўклад, які павінен уступіць у сілу ў 2018 — 2020 годзе. Ён будзе звязаны з біякамп'ютарнымі тэхналогіямі і альтэрнатыўнай энергетыкай.

У нашай краіне ёсць даследаванні па нанаструктураваных пакрыццях, нанаэлектроніцы, малекулярнай нанафатоніцы, аптычных нанаматэрыялах. Усе сферы, дзе гэта можа быць выкарыстана, ужо прысутнічаюць у структуры айчыннай прамысловасці. Таксама некаторыя распрацоўкі могуць быць запатрабаванымі ў сельскай гаспадарцы і машынабудаванні. У цэлым, каб патрапіць у новы тэхналагічны ўклад, нашай краіне неабходна мець прынцыпова новыя напрацоўкі. Я і мае калегі вывучаем інавацыйныя арганізацыі ў нашай краіне, якія вядуць даследаванні на пятым — шостым тэхналагічных укладах. Такіх арганізацый у нас больш за 100. Ужо сёння ў краіне ёсць 5 арганізацый, якія працуюць на шостым тэхналагічным укладзе. А гэта сведчыць аб тым, што навука Беларусі ў некаторых сферах ужо сёння апярэджвае час. Ёсць і іншыя арганізацыі, якія вядуць свае даследаванні часткова на пятым і шостым тэхналагічных укладах. Дзякуючы ім, у нас ужо цяпер можа быць створаны высокатэхналагічны кластар па аказанні паслуг і вытворчасці прадукцыі, якія ў будучыні могуць заняць вялікую долю ў аб'ёме ВУП краіны. Гэтыя арганізацыі працуюць у сферах ахове здароўя, матэрыялазнаўства, біятэхналагічных даследаванняў.

> **«Шосты тэхналагічны ўклад зможа ўкараніцца і развівацца ў нашай краіне толькі праз стварэнне сеткавага інавацыйнага кластара».**

***— Што маецца на ўвазе пад кластарам і якія перашкоды ёсць на шляху яго стварэння?***

— Кластар па азначэнні — група ўзаемазвязаных арганізацый, якая сканцэнтравана на пэўнай тэрыторыі. Удзельнікі групы павінны займацца прыблізна аднолькавымі распрацоўкамі і даследаваннямі альбо блізкімі тэхналогіямі, якія б дапаўнялі адна адну і ўзмацнялі канкурэнтныя перавагі асобных кампаній і кластара ў цэлым. Гаворка ідзе пра разнастайнасць інавацыйнай сеткі, у ядры якой знаходзіцца інавацыйныя арганізацыі часцей без вытворчых кампаній, таму што даследаванні могуць быць яшчэ не скончаны і ў вытворчасці няма патрэбы. Вытворчы сектар узнікае, як правіла, пазней. Шосты тэхналагічны ўклад зможа ўкараніцца і развівацца ў нашай краіне толькі праз стварэнне сеткавага інавацыйнага кластара. Для з'яўлення кластара ў Беларусі ёсць шэраг праблем. Напрыклад, сёння павінны мяняцца арганізацыйныя формы таго, як праводзяцца і фінансуюцца даследаванні.

***— Якія вы бачыце шляхі выхаду з гэтай сітуацыі, што неабходна, каб інавацыйны сектар эфектыўна развіваўся?***

— Варта адзначыць, што кожны вытворца стараўся ўтаіць свае даследаванні, каб яны не трапілі ў рукі канкурэнтаў. Сёння ўсё будзе развівацца па прынцыпе адкрытых інавацый і з'яўлення старт-апаў. Менавіта яны будуць дапрацоўваць і ўвасабляць у жыццё ідэі. Таксама зацікаўленыя асобы пры ўваходзе ў кластар будуць атрымліваць некаторыя прэферэнцыі. Дарэчы, вялікую ролю павінен адыграць закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. У інавацыйную сферу варта прыцягваць у далейшым інвестыцыі бізнесу і дзяржавы. Адпаведны закон у нас ужо ёсць. Аднак у гэтым законе сёння не прапісана інавацыйная сфера. Безумоўна, у законе павінна з'явіцца папраўка або патрабуецца нават асобны закон для інавацыйнага бізнесу. Яго назва павінна гучаць прыблізна так: «Аб дзяржаўнай падтрымцы тэхналагічных інавацый». Варта ўнесці і шэраг паправак у антыкарупцыйнае заканадаўства, каб разнявольніць навукоўцаў. У адваротным выпадку інавацыйная эканоміка ў нас не запрацуе.

Акрамя таго, нам трэба перагледзець механізм вяртання дзяржаўных інвестыцый на навуковыя распрацоўкі. Каб тэрміны не ціснулі на інавацыйныя арганізацыі і была магчымасць вяртаць грошы ў доўгатэрміновай перспектыве. Не лішнім будзе стварэнне такіх умоў, калі ідэя вучонага, якая паспяхова ўкараняецца ў распрацоўцы іншых прадуктаў, яму аплачваецца ў залежнасці, скажам, ад колькасці продажаў. Таксама для фарміравання кластара неабходна ствараць венчурныя фонды, якія будуць папаўняцца за кошт прыбытку інавацыйных прадпрыемстваў. Пры гэтым дзяржава не будзе забіраць адтуль сродкі, нават нягледзячы на тое, што стварэнне інавацыйных арганізацый яна фінансавала за кошт бюджэту. Затрачаныя рэсурсы дзяржаве будуць вяртацца ў выглядзе падаткаў і стварэння новых працоўных месцаў у інавацыйнай кампаніі або інстытуце.

Сабраць усе фірмы ў кластар — гэта яшчэ толькі паўсправы. Важна стварыць умовы ўнутры гэтага аб'яднання для беспярашкоднага транзіту ідэй і свабоды ад фінансавага ціску і антыкарупцыйнага закона.

***— Шосты тэхналагічны ўклад будзе грунтавацца на дасягненнях пятага, дзе асноўную ролю адыгрывалі інфармацыйныя тэхналогіі. Сёння беларускія IT-кампаніі аказваюць аўтсорсінгавыя паслугі па распрацоўцы праграмнага забеспячэння за немалыя грошы. Ці змогуць сабе гэта дазволіць айчынныя арганізацыі шостага тэхукладу?***

— Так, гэта сапраўды дарагія паслугі па нашых мерках. Але я думаю, што IT-кампаніі будуць зацікаўлены ў супрацоўніцтве з такімі перспектыўнымі арганізацыямі. Больш таго, яны змогуць выступіць драйверам іх росту, калі будуць прадастаўляць свае напрацоўкі. Яны цалкам могуць кааперавацца і сумесна ствараць стартапы. У Аўстрыі ёсць кластар, які развіваецца па зусім новым накірунку — біяінфарматыцы. Безумоўна, гэта ў нас таксама магчыма, улічваючы поспех і вядомасць беларускага IT-сектара.

***— З кім беларускім інавацыйным арганізацыям неабходна супрацоўнічаць больш: з ЕС або ЕАЭС?***

— Нам неабходна супрацоўнічаць з усімі на ўзаемавыгадных умовах. Аднак пры кааперацыі кластараў розных краін узнікаюць праблемы па прыналежнасці інтэлектуальнай уласнасці, напрыклад. Тут патрэбна добрая заканадаўчая база, якая будзе рэгуляваць у тым ліку і магчымыя канфліктныя сітуацыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

## Да 2020 года малыя прадпрымальнікі пяройдуць у нанаіндустрыю?

**Беларускія навукоўцы лічаць, што сёння найбольшы поспех у нанаіндустрыі можна чакаць ад малых прыватных прадпрыемстваў. На думку першага намесніка старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Сяргея Чыжыка, нанасфера вельмі затратная і патрабуе кантролю. Для арганізацыі буйной вытворчасці ў нанаіндустрыі неабходны вялікія інвестыцыі, што вельмі рызыкоўна. Малыя прадпрыемствы з гэтай задачай павінны справіцца значна больш эфектыўна.**

**Па словах начальніка ўпраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Мінэканомікі Дзмітрыя КРУПСКАГА**, сёння нанаіндустрыя толькі фарміруецца і ўяўляе сабой міжгаліновы комплекс. Зараз у краіне налічваецца каля 30 прадпрыемстваў, звязаных з нанатэхналогіямі, дзе працуюць 2 тысячы чалавек. Усе яны выпрацоўваюць аб'ём прадукцыі, які дасягае 20 млн долараў штогод. Каб стымуляваць гэтую сферу, якая, дарэчы, можа хутка заняць важныя пазіцыі ў эканоміцы краіны, урад плануецца шэраг прэферэнцый для малога бізнесу. Напрыклад, гаворка ідзе аб з'яўленні грантаў для малога прадпрымальніцтва, прадстаўнікі якога будуць займацца развіццём і камерцыялізацыяй гэтай галіны. Па словах Дзмітрыя Крупскага, ужо пачалася стадыя ўнутрыдзяржаўных узгадненняў па праекце Сусветнага банка, дзе адным з кампанентаў з'яўляецца грантавая падтрымка ў першую чаргу малога інавацыйнага прадпрымальніцтва. Плануецца, што сума грантаў будзе вар'іравацца ў межах ад 15 да 500 тысяч долараў. «Мяркую, што да канца гэтага года пагадненне з Сусветным банкам будзе падпісана і з 2017 года ўжо пачнецца конкурсны адбор», — удакладніў Дзмітрый Крупскі.

Таксама ён адзначыў, што на стадыі прапрацоўкі знаходзяцца два праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Адзін з іх прадугледжвае стварэнне інфраструктуры падтрымкі стартап-руху, у тым ліку ў сферы нанатэхналогій. Другі — стварэнне сеткі тэхналагічных бізнес-акселератараў. Гэтая сетка дазволіць распрацоўшчыкам, якія не маюць досведу камерцыялізацыі нанатэхналогій, набыць неабходныя кампетэнцыі ў галіне стварэння інавацыйнага бізнесу. Праекты плануецца ажыццявіць да 2018 года. Калі яны эфектыўна запрацуюць, то ўжо да 2020 года ў Беларусі з'явіцца развіты сектар малога нанатэхналагічнага прадпрымальніцтва.

Акрамя таго, для развіцця нанаіндустрыі, па словах Дзмітрыя Крупскага, у краіне плануецца стварыць спецыялізаваную інфраструктуру. Зараз адпаведны дакумент знаходзіцца на стадыі падрыхтоўкі. Згодна з ім будзе пабудаваны бізнес-інкубатар у галіне нанаіндустрыі, а таксама створаны і абсталяваны некалькі інжынірынгавых цэнтраў калектыўнага карыстання ўнікальным навуковым абсталяваннем у розных галінах эканомікі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
20 КАСТРЫЧНІКА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15803)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

# PAULINE: «Спяваю для душы́. Але не ў ду́шы!»

**Яе сцэнічнае імя адразу прываблівае сваёй беларускасцю, нагадвае пра найстарэйшы спектакль Купалаўскага тэатра. «Pauline», ці «Паўліна» — такі псеўданім узяла сабе і свайму гурту Паліна Цімохіна. Сёлета яны ўжо паспелі перамагчы ў конкурсе «Заспявай 3.0» у намінацыі «Спяваная паэзія», а летась сталі «Адкрыццём года» прэміі «Героі года». Усе яе песні, стыль якіх цяжка вызначыць, бо ён вагаецца ад папулярнай музыкі да блюзу, ад фолку да року, — выключна па-беларуску. У хуткім часе — узімку — гурт плануе выпусціць дэбютны альбом. А пакуль Паўліна спрабуе спалучыць працу і творчасць, адшукаць час і для асабістага жыцця, і для сяброў, спяшаецца, бяжыць па жыцці з думкай «Людзі, дзе вы?», якая ўвасобілася ў яе апошняй песні пра адзіноту ў вялікім горадзе занятага чалавека...**

***— З чаго пачынаўся гурт?***

— Я вучылася ў музычнай гімназіі. За той час атрымала самы разнастайны вопыт: спявала ў фальклорным калектыве, у хоры, займалася акадэмічным вакалам, іграла на фартэпіяна. Першую песню напісала ў 13 гадоў. Менавіта тады адчула, што магу ствараць сама. Потым не раз выступала, але свае песні выконваць не даводзілася. Праект «Паўліна» з'явіўся ў 2013 годзе і быў выключна маёй ініцыятывай. На яго ішло і шмат сіл, і вялікая колькасць грошай. Праз нейкі час, калі ўжо напрацавала матэрыял і мне было што прапанаваць слухачам, стала шукаць музыкантаў, каб стварыць гурт.

Заўжды былі такія людзі, якія казалі: «у цябе нічога не атрымаецца»; «паслухай, нашто табе гэтыя музыкі?» Але ўсяго за паўгода атрымалася адшукаць аднадумцаў. У 2015-м адбылося наша першае сумеснае выступленне на фестывалі «Revolution Music Fest». З таго моманту нас сталі пастаянна запрашаць на канцэрты. Хутка і зусім нечакана сталі «Адкрыццём года». У пэўным сэнсе гэта быў аванс, які цяпер мы спрабуем апраўдаць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



*Увага, конкурс!*

# Будучыя журналісты, чакаем вашы «пробы пяра»!




**«Чырвонка. Чырвоная змена» абвяшчае аб пачатку чарговага творчага спаборніцтва для юных і маладых няштатных аўтараў**

**Адразу некалькі слоў пра назву традыцыйнага творчага конкурсу, які праводзіцца нашым маладзёжным дадаткам. Яе вырашана зрабіць пастаяннай. Нагадаем, гэта назва была прыдумана напярэдадні Года моладзі і, як падаецца, найбольш удала сфармулявала тыя мэты і задачы, якія пераследуе наш творчы конкурс, выступаючы ў якасці своеасаблівай пляцоўкі для самавыяўлення: даць юным і маладым аўтарам магчымасць расказаць пра сваю пазіцыю, пра стаўленне равеснікаў да тых ці іншых праблем грамадства, у тым ліку найперш — да сферы маладзёжнай палітыкі, расказаць пра іх асабісты ўклад у тую ці іншую справу. Пагадзіцеся, цяжка больш ёмка абазначыць словамі тое, да чаго ў выніку імкнецца «Чырвонка. Чырвоная змена» і чаго маладзёжны дадатак чакае ад удзельнікаў конкурсу. Спадзяёмся, яго назва стане адным з нашых лепшых і даўгавечных трэндаў сярод іншых пастаянных рубрык.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*




Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

**Двое з трох пераможцаў мінулага конкурсу: Настасся Гарост (злева) і Дар'я Свірыда.**

*Працоўны семестр*

# СЛЕД НА СТО ГАДОЎ НАПЕРАД

## ПАКІНУЦЬ СТУДЭНТЫ НАШЧАДКАМ У ЛЕСЕ

**...Мясціна выглядае злавесна. Наводдаль застылі зламаныя напалову дрэвы без галін. Перад імі — поле з перарытай, засыпанай попелам зямлёй. Бачны абсмаленыя карчы, у шэра-рудой гразі ляжаць цурбаны ды дзе-нідзе трапляюцца лапікі ігліцы. Пейзаж варты дэкарацыі для якога-небудзь фантастычнага фільма-катастрофы. Аднак гэта не кадры кінастужкі, а лясная дзялянка недалёка ад Мінска.**



**Уладзіслаў Юпашоў і Сяргей Карчэўскі спрацаваліся адразу.**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ГЭТЫМ летам над Беларуссю пранесліся ўраганныя вятры. Яны зрывалі шыфер з дахаў, разбуралі збудаванні і ламалі дрэвы. У Мінскай вобласці асабліва моцна стыхія прайшлася па Смалявіцкім і Чэрвеньскім раёнах. Напрыклад, толькі ў Смалявіцкім лясгасе каля 5700 гектараў лесу былі ператвораны ў буралом. Ляснік Валмянскага лясніцтва Смалявіцкага лясгаса Мікалай Манулік працуе 23 гады, але такіх разбурэнняў прыгадаць не можа:

— Падобныя страты ў нас толькі сёлета. Раней вятры таксама валілі дрэвы, але плошчы былі меншыя. З пашкоджаных участкаў драўніна вывозіцца, дзялянка ачышчаецца і заворваецца, аднак аднавіць увесь загублены лес сіламі аднаго лясгаса за кароткі тэрмін — задача вельмі складаная.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
20 10 2016 г.

Цікавы досвед

# У ФОНАВЫМ РЭЖЫМЕ

## Калі раней усе верылі газетам, то цяпер — «Фэйсбуку»

**«Хто куды, а мы — на дно!» — артыкул пад такой назвай быў змешчаны ў адным з апошніх нумароў «Чырвонкі.Чырвонай змены». Даведацца пра яго змест Таццяна Барткевіч, настаўніца беларускай мовы і літаратуры з Глыбоцкай раённай гімназіі, прапанавала сваім вучням. Ідэю працы з газетнымі загалоўкамі яна падгледзела на міжнародным семінары ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, дзе сваім досведам у медыяадукацыі з беларускімі калегамі падзяліліся чэшскія педагогі.**



На сваіх уроках Павел Мартыноўскі вельмі любіць працаваць з карыкатурамі і нестандартнымі картамі...

### ПАБЫЦЬ ЖУРНАЛІСТАМ

Чытачы «Чырвонкі», канешне, ведаюць, што ў артыкуле распавядалася пра дайвераў. Але ж фантазію школьнікаў, перад якімі стаяла задача напісаць пад гэтым загалоўкам свой артыкул, каб потым параўнаць яго з арыгіналам, ніхто не абмяжоўваў. Скандал з расійскімі футбалістамі, якія адзначылі сваё паражэнне на чэмпіянаце Еўропы, спусціўшы на элітнае шампанскае ў начным клубе Монтэ-Карла больш як 200 тысяч еўра і тым самым яшчэ больш зняславіўшы сваю каманду, таксама цудоўна ўпісаўся ў гісторыю пра «дно». Гэты варыянт прапанаваў адзін з юнакоў-футбалістаў. Не менш цікавымі былі аповеды старшакласнікаў і пад іншымі загалоўкамі артыкулаў «Звязды»: «Калі б людзі маглі гаварыць», «Навукоўцы раскрылі сакрэт дэжавю», «Сапраўдныя мужчыны»...

Такі нестандартны практыкаарыентаваны ўрок быў праведзены настаўніцай у 11 класе, дзе мова выкладаецца на павышаным узроўні. Пры вывучэнні тэмы «Публіцыстычны стыль мовы» яна паспяхова рэалізавала ідэю чэшскага гісторыка Паўла Мартыноўскага. Гэта форма работы наглядна прадэманстравала, што адны і тыя ж словы могуць выклікаць розныя асацыяцыі. Вучням было цікава, што хаваецца за пэўным загалоўкам. Атрымалася, што яны не толькі самі пабылі ў ролі журналістаў, але прачыталі і прааналізавалі газетны артыкул, напэўна, з большай цікавасцю, чым калі-небудзь...

### АД ВОГНІШЧА — ДА АЙПАДА

Да слова, чэшскія настаўнікі часта скардзяцца, што іх выхаванцы не надта цікавяцца навінамі ў СМІ. Гэта пацвярджаюць і даследаванні, праведзеныя факультэтам сацыяльных навук Карлава ўніверсітэта ў 2012-м і 2014-м гадах. Размаўляць у школе аб тым, якія тэмы зараз дамінуюць у медыя, аказалася неэфектыўным. Але **як выхаваць адукаваную асобу, здольную арыентавацца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы, якая ўсё больш нагадвае медыяджунглі?** Пошукі адказаў на гэта пытанне даўно вядуцца ў многіх краінах. У Чэхіі, пачынаючы з 2006 года, медыяадукацыя ўключана ў абавязковую вучэбную праграму ўсіх базавых школ і гімназій (ёй ахоплены вучні ад 7 да 15 гадоў). На нацыянальным узроўні сфармуляваны чаканыя вынікі ад укаранення такой адукацыі, але кожная школа сама вырашае, як яна будзе рэалізоўваць медыяадукацыю: як асобны прадмет або як скразную тэму ў рамках розных прадметаў, ці камбінаваць першае і другое?

— У старажытныя часы племя збіралася вакол вогнішча, каб абмеркаваць усе свае надзённыя справы. У сярэднявеччы такім своеасаблівым цэнтрам абмену інфармацыяй паміж членамі сям'і стаў стол. Да яго запрашалі і вандроўнікаў, якія прыносілі весткі. Потым з'явілася радыё, але традыцыя яшчэ захоўвалася — сям'я збіралася вакол радыёкропкі. Праўда, з'явілася першая праблема: прадстаўнікам старэйшага пакалення ўжо было складана зразумець прагрэс. І так атрымалася, што носьбітам інфармацыі паступова стала маладое пакаленне, — апісвае эвалюцыю медыя **намеснік дырэктара базавай школы «Вратыслаўска» горада Прагі, настаўнік гісторыі Павел МАРТЫНОЎСКІ.** — Затым з'явіўся тэлевізар, і сям'я ўжо рассаджвалася не вакол яго, а ў адну лінію. І тыя, хто побач, яшчэ могуць адзін аднаго пачуць, але вельмі цяжка размаўляць з тымі, хто сядзіць з краю. Сёння ўжо ў кожнага свой камп'ютар, смартфон ці планшэт. Але дзецям ніхто не тлумачыць, як фільтраваць інфармацыю. Вось чаму рэзка ўзрастае роля школы, якая павінна навучыць дзяцей крытычна ставіцца да любой інфармацыі і шукаць праўду. Калі раней усе верылі газетам, то цяпер — «Фэйсбуку».

— Штодня мы бачым, як нават самыя маленькія вучні хутка асвойваюць сучасныя тэхналогіі, як камунікуюць у віртуальным свеце, як прымаюць і перадаюць інфармацыю людзям у сваім акружэнні, — падтрымлівае калегу **настаўнік першай ступені навучання базавай школы горада Паненскі Тынец Іржы БЕНЕШ.** — Кожнае імгненне, калі мы анлайн, на нас льецца мноства як патрэбнай, так і непажаданай інфармацыі. Таму выхаванне дзяцей у сферы медыя і інфармацыі павінна распачынацца як мага раней. У нашай школе на ўроках чэшскай мовы ў рамках праектнага навучання мы пачалі ўключаць аспекты медыяадукацыі ўжо на першым годзе вучобы.





Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Адзінаццацікласнікі не толькі самі пабылі ў ролі журналістаў, але прачыталі і прааналізавалі газетны артыкул, напэўна, з большай цікавасцю, чым калі-небудзь.

### СУД НАД ГРЫНЧАМ

Асноўнай задачай праекта «Медыя — якія яны?» было пазнаёміць дзяцей з рознымі іх відамі: параўнаць, вылучыць моцныя і слабыя бакі. Натуральна, што першакласнікаў не так і проста зацікавіць. Таму ў якасці аб'екта для вывучэння былі абраныя мультфільм «Крот на Калядах» і кніжны варыянт гэтай казкі. У далейшай дыскусіі дзеці павінны былі параўнаць інфармацыю, якую яны атрымалі з розных медыя. Вучні апісвалі, што ёсць у фільме, у кніжным варыянце, а чаго там няма, якім спосабам перададзена інфармацыя, ацэньвалі эфектыўнасць усіх спосабаў і аб'ём інфармацыі. Цікава, што кніжнаму варыянту дзеці выставілі станоўчыя балы за паўнату інфармацыі і эфектыўнасць яе засваення (адзначылі, што інфармацыю прасцей апрацаваць), а таксама за тое, што кніжка пакідае прастору для фантазіі. А галоўны недахоп дзеці ўбачылі ў тым, што кніжны варыянт аднімае ў іх шмат часу. Мультфільм, у сваю чаргу, ідэальны для хуткага прагляду, вось толькі інфармацыі там зашмат і з яе складана выбраць важную, затое вельмі проста штосьці не заўважыць.

Іржы Бенеш расказаў, што далейшымі крокамі ў праекце, які яшчэ працягваецца, стане параўнанне інтэрнэту, радыё, кніг і аўдыявізуальных медыя. Вучні будуць параўноўваць інфармацыю, якую яны змогуць знайсці ў сеціве, з той, што атрымаюць у выглядзе тэлевізійных ці радыёдакументаў або навін.

**«Калі XX стагоддзе было стагоддзем бітвы за доступ да інфармацыі, то XXI стагоддзе стала стагоддзем злоўжывання інфармацыяй».**

Не менш цікавы праект настаўнік рэалізаваў і з чацвертакласнікамі — «Пакажы свой горад». Клас быў падзелены на тры групы: адны павінны былі прэзентаваць родны горад з дапамогай рэферата, другія стваралі электронную кнігу, а трэція — здымалі відэаролік. Канешне, мала хто ўзрадаваўся перспектыве працаваць над рэфератам, для якога трэба было збіраць сур'ёзную правераную інфармацыю, звяртацца ў бібліятэку. Для электроннай кнігі можна было сабраць кантэнт і ў інтэрнэце. А самай прывабнай усім падалася праца над відэаролікам. Затым усе паспрабавалі сфармуляваць праблемы, звязаныя з працай над канкрэтнымі медыя, ацанілі, як яны на іх уплываюць, сфармулявалі, якія медыя і для якой мэты больш падыходзяць. Галоўнае — школьнікі зразумелі, што ў прынцыпе адну і тую ж інфармацыю можна падаваць па-рознаму.

А ў пятым класе вучні сталі ўдзельнікамі праекта «Грынч», у аснову якога лягла кіноказка «Грынч — выкрадальнік Ражства». І зноў клас быў падзелены на тры групы: на суддзяў, адвакатаў і абвінаваўцаў. У прадстаўнікоў кожнай з іх былі свае аргументы. Грынча «асудзілі», але не вельмі сурова. Затое дзеці навучыліся прымаць іншы пункт погляду, прыслухоўвацца да чужых аргументаў.

Настаўнік гісторыі Павел Мартыноўскі, які працуе са старэйшымі школьнікамі, таксама выкарыстоўвае падобны прыём. Калі вучні вывучаюць па праграме тэму «Другая сусветная вайна», ён ладзіць «Нюрнбергскі працэс». Школьнікі вывучаюць біяграфію дзеячаў фашысцкай Германіі. Яны павінны іх або асудзіць, або апраўдаць... Калі старшакласнікі знаёмяцца з гісторыяй канструктара Вернера фон Брауна, стваральніка ракет Фау-2, якімі ў 1944—1945 гадах бамбілі Лондан, усе жадаюць яму смяротнага пакарання. Можна зразумець шок падлеткаў, калі тыя даведваюцца, што Вернер фон Браун нават не сядзеў у турме, а пасля вайны працягваў працу над ракетамі, толькі ўжо пад крылом амерыканцаў, у рукі якіх ён здаўся.

На сваіх уроках Павел Мартыноўскі вельмі любіць працаваць з карыкатурамі і картамі.

— Часта карыкатура можа сказаць нават больш, чым фота, а ўстанаўленне яе аўтарства і высвятленне пазіцыі стваральніка дазваляе вучням убачыць падзеі з розных бакоў, прааналізаваць розныя пункты гледжання, пагрузіцца ў адпаведны кантэкст гістарычнай эпохі, — тлумачыць ён.

### СЯРЭДНЕВЯКОВЫ МЕДЫЯТЭКСТ

Хоць для беларускіх педагогаў медыяадукацыя яшчэ адносна новая практыка, у іх ужо таксама хапае цікавых знаходак, якімі яны ахвотна дзеляцца са сваімі калегамі.

— Што галоўнае на ўроку гісторыі? Для мяне вельмі важна, калі вучні выказваюцца, а ў вачах бачны думка і разважанне, — падкрэслівае **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Глыбоцкай раённай гімназіі Іна ШЫМКО.** — Нядаўна мы вельмі актыўна вывучалі тэму «Паўсядзённае жыццё чалавека» ў 6 класе. Паколькі ўсе аспекты абмеркаваць на ўроку проста немагчыма, вырашылі ўзяць толькі адзін накірунак — моду. Практычна ўсе хацелі рыхтаваць паведамленні і шукаць цікавыя факты пра моду, таму мы падзяліліся на групы — шукалі звесткі пра жаночае адзенне, мужчынскае, адзенне для багатых і бедных, проста нешта цікавае з гісторыі моды сярэднявечча. **Правялі міні-даследаванне і сфармулявалі гіпотэзу: сярэдневяковы касцюм — гэта медыятэкст,** які ўтрымлівае інфармацыю аб сацыяльным статусе чалавека, аб палітычнай сітуацыі і эканамічным развіцці. Чым вышэйшы галаўны ўбор, тым больш знатная дама; доўгія рукавы — прыкмета заможнасці (з такімі рукавамі не будзеш займацца фізічнай працай); чым даўжэйшы нос абутку, тым больш высокі статус чалавека; пальчаткі — сімвал улады; яркае адзенне — толькі для багатых, а для бедных — руды і шэры колеры, на якіх незаўважны бруд і гэтак далей. Вам цікава, як па адзенні можна адновіць палітычныя і эканамічныя падзеі? Напрыклад, шоўк і аксаміт з'явіліся ў гардэробе ў выніку крыжовых паходаў. Футра — як упрыгожванне на адзенні — дзякуючы гандлёвым зносінам з краінамі Паўночнай Еўропы. І такіх паралеляў можна прыводзіць шмат. Падобным чынам можна працаваць і з карцінамі, і з архітэктурнымі помнікамі.

На міжнародным семінары адбылася прэзентацыя двух вучэбных дапаможнікаў. **Дапаможнік «Медыяадукацыя ў сучаснай школе»** стаў сумеснай працай беларускіх і чэшскіх педагогаў. А **дапаможнік «Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў»** ствараўся сіламі выключна беларускіх настаўнікаў, метадыстаў, выкладчыкаў ВНУ і журналістаў. Гэта сапраўдны навігатар для педагогаў, якія робяць першыя крокі ў гэтым кірунку. Да таго ж створаны і электронны варыянт дапаможніка, які знаходзіцца ў свабодным доступе і які будзе пастаянна актуалізавацца.

«Калі XX стагоддзе было стагоддзем бітвы за доступ да інфармацыі, то XXI стагоддзе стала стагоддзем злоўжывання інфармацыяй, — лічыць адзін з аўтараў дапаможніка, **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы Тамара МАЦКЕВІЧ.** — Медыя інтэграваныя ў наша жыццё настолькі, што большасць паведамленняў мы атрымліваем у фонавым рэжыме, не звяртаючы на іх увагі. Медыяадукацыя ўзнікла як спосаб дапамогі вучням, якія жывуць у інфармацыйным грамадстве і залежаць ад тэхналогій. Гэта выхаванне ў іх здольнасці глядзець на свет самастойна і прымаць свае ўласныя рашэнні».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

# «Што вам даставіць з кірмаша?»

**Валанцёры ГА «БРСМ» «Добрае Сэрца» Мінска да канца месяца будуць дастаўляць сельскагаспадарчую прадукцыю з плодаагароднінных кірмашоў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам першай і другой групы, а таксама ўсім пенсіянерам.**

Працоўны дэсант Саюза моладзі ў вопратцы з сімволікай «БРСМ» дзяжурыць на двух найбуйнейшых кірмашах — на пляцоўках каля Палаца спорту і вялікай арэны «Чыжоўка-Арэна». Дапамогу ў дастаўцы сельскагаспадарчай прадукцыі аказваюць прадстаўнікі сталічных вышэйшых навучальных устаноў — БДУ, БДЭУ, БДТУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Дастаўка таксама вядзецца на сельскагаспадарчых кірмашах амаль ва ўсіх раёнах Мінска.




# Адзначылі юбілей арганізацыі справамі

**Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя ратавальнікаў-пажарнікаў адзначыла сваё 15-годдзе. Да гэтай даты ва ўсіх рэгіёнах было прымеркавана шэраг мерапрыемстваў.**

Напрыклад, у Мінску ў рамках рэспубліканскай акцыі «Моладзь за бяспеку» актывісты арганізацыі аказвалі дабрачынную дапамогу шматдзетным сем'ям, адзінока пражываючым пенсіянерам, ветэранам і інвалідам па розных бытавых пытаннях (устаноўка аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, нарыхтоўка дроў, уборка тэрыторыі і г.д.). Разам з работнікамі МНС моладзь наведвала сацыяльныя прытулкі і дамы-інтэрнаты, агульнаадукацыйныя ўстановы. Юныя ратавальнікі-пажарнікі расказвалі аднагодкам аб арганізацыі і яе дзейнасці, мерапрыемствах, якія праводзяцца.

Юныя ратавальнікі з Гомеля сёлета да 15-годдзя арганізацыі прыдумалі акцыю «112 добрых спраў». У кожным раёне вобласці, пачынаючы яшчэ з сакавіка, актывісты рабілі добрыя справы, прысвячаючы іх гэтай даце. У Віцебску да яе прымеркавалі правядзенне першых гарадскіх спаборніцтваў па пажарна-выратавальнаму спорту сярод юнакоў і дзяўчат. У Брэсце прайшло флэшмоб-шэсце ў цэнтры горада, пасля якога былі арганізаваны канцэртная праграма ад самых таленавітых удзельнікаў акцыі і выстава пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі і абсталявання.



# Чысціня і ўтульнасць ад «Добрага Сэрца»

**У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям» сталічныя валанцёры руху «Добрае Сэрца» наведалі адзінокую пенсіянерку Вольгу Данілаўну Леановіч, якая нядаўна адзначыла свой 80-гадовы юбілей.**

Вользе Данілаўне, інваліду другой групы, цяжка самастойна падтрымліваць чысціню і ўтульнасць у кватэры. Таму валанцёры Саюза моладзі ўжо не ў першы раз аказваюць дапамогу ў генеральнай прыборцы жылля пенсіянеркі. Удзельнікі валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» старанна правялі сухую і вільготную прыборку пакояў, вымылі і падрыхтавалі да зімы вокны. У гэты дзень валанцёры змаглі дапамагчы не толькі Вользе Данілаўне, але і яе суседкам па доме — Марыі Іванаўне Дзяргай, 1933 года нараджэння, і Наталлі Іванаўне Стрэчань, 1923 года нараджэння. Яны даведаліся пра акцыю, а маладым людзям было не цяжка прыбраць у кватэрах гэтых пажылых жанчын.

# Пад увагай валанцёраў — культавыя аб'екты

**Валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» падвялі вынікі рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі», арганізаванай у рамках супрацоўніцтва грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» з вядучымі канфесіямі краіны. Нагадаем, што яна рэалізуецца з 2013 года, а пачынаючы з гэтага года акцыя праходзіць пры падтрымцы апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь.**

У ходзе рэалізацыі праекта ўдзельнікі валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» праводзяць працоўныя акцыі, скіраваныя на добраўпарадкаванне і аднаўленне культавых аб'ектаў — цэркваў, сабораў, касцёлаў, арганізоўваюць выставачныя экспазіцыі, канферэнцыі, чытанні, адкрытыя дыялогі, прэзентуюць відэаролікі, якія расказваюць аб мясцовых святынях і культавых аб'ектах.

Так, з 2013 года актывісты БРСМ прывялі ў парадак каля 780 культавых аб'ектаў па ўсёй Беларусі. Толькі за сёлетні год сіламі 3 600 добраахвотнікаў упарадкавана каля 250 культавых аб'ектаў, з іх — 30 каталіцкай канфесіі.

Напрыклад, валанцёры Смаргонскай раённай арганізацыі БРСМ правялі рэстаўрацыйныя работы па абнаўленні касцёла Яна Паўла ІІ. Моладзь займалася абліцоўваннем і тынкоўкай агароджы, афарбоўкай помніка, добраўпарадкаваннем прылеглай да храма тэрыторыі. Удзельнікі Першамайскай раённай арганізацыі Віцебска аказалі пасільную дапамогу ў будаўніцтве храма Іконы Божай Маці: залівалі фундамент, займаліся афарбоўкай, прыводзілі ў парадак тэрыторыю. Валанцёры Любанскай раённай арганізацыі аказалі дапамогу ў будаўніцтве прыхода храма Казанскай Божай Маці ў райцэнтры. У Краснапольскім раёне дапамаглі аднавіць святую крыніцу ў вёсцы Міханавічы. На рэканструкцыі Лядзенскага манастыра, добраўпарадкаванні храма і прыхрамавай тэрыторыі працавалі валанцёрскі атрад «Добрае Сэрца» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Добраахвотнікі руху «Добрае Сэрца» Пінскай гарадской арганізацыі займаліся ўпарадкаваннем вайсковых, праваслаўных, каталіцкіх і ўніяцкіх яўрэйскіх пахаванняў на гістарычных могілках па вуліцы Спакойная ў горадзе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Будучыя журналісты, чакаем вашы «пробы пяра»!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Застаюцца без змен і ўмовы правядзення творчага спаборніцтва, «адшліфаваныя» на працягу некалькіх гадоў. Нагадваем: вялікая просьба да будучых юных і маладых аўтараў і іх куратараў — уважліва азнаёмцеся з абавязковымі ўмовамі, якім павінны адпавядаць дасланыя работы.

Конкурс, як і папярэднія, разлічаны найперш на беларускамоўную моладзь, якая збіраецца паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы, каб у далейшым, магчыма, звязаць сваё жыццё з гэтай прафесіяй. Нагадаем, што яго творчая планка даволі высокая, каб малады чалавек, які збіраецца прысвяціць сваё жыццё гэтай цікавай, але нялёгкай сферы, змог пакаштаваць «журналісцкага хлеба» і цвяроза ацаніць свае здольнасці.

Зноў жа традыцыйная просьба: не пішыце матэрыялы агульнымі словамі, не разважайце пра ўсім вядомае. Раскажыце — цікава! — пра канкрэтную падзею, мерапрыемства, якое арганізавала моладзь, каб выказаць сваю неабыякавасць да той ці іншай праблемы ці сітуацыі. Знайдзіце маладых людзей, якія сваімі справамі паказваюць такі прыклад.

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Тым з іх, хто налета збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, рэдакцыя дасць яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Найлепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» можа працягваць друкаваць і надалей. **Вынікі плануецца падвесці ДА ПАЧАТКУ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ.**

Матэрыялы на конкурс можна дасылаць на электронны адрас konkurschz@mail.ru або на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда») з абавязковай паметкай «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»

**Абавязковыя ўмовы, якім павінны адпавядаць конкурсныя работы:**

1. «Проба пяра» павінна быць ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.
2. Тэксты дасылаюцца ў фармаце RTF (калі па пошце, дык у раздрукаваным выглядзе, а фотаздымкі — на дыску).
3. Кожная ілюстрацыя ці фотаздымак да тэксту дасылаецца АСОБНЫМ прымацаваным файлам.
4. Аб'ём конкурсных работ — не больш за 8 тысяч знакаў (з прабеламі).
5. Колькасць «проб пяра» ад аднаго аўтара не абмежавана, аднак пры вялікай колькасці конкурсных работ кожнаму ўдзельніку (пры ўмове належнай якасці матэрыялаў і адпаведнасці ўмовам конкурсу) даецца па адным шанцы. Астатнія яго матэрыялы будуць надрукаваны (зноў жа пры ўмове належнай іх якасці) як звычайныя журналісцкія — па-за конкурсам.
6. Узрост удзельнікаў таксама не абмежаваны, але найперш конкурс разлічаны на навучэнцаў старшых класаў.
7. Жанр «проб пяра» — любы, але гэта павінна быць толькі проза (нататка, рэпартаж, эсэ, замалёўка, інтэрв'ю).
8. Пажадана, каб матэрыял быў напісаны спецыяльна для конкурсу. Вялікая просьба не дасылаць школьных сачыненняў, рэфератаў (і па форме, і па змесце), асабліва падрыхтаваных пэўны час таму. На пачатку тэксту павінен быць загаловак (назва конкурсу не з'яўляецца такім), напрыканцы — імя і прозвішча аўтара.
9. Аўтар абавязаны пазначыць свае пашпартныя звесткі (нумар і серыя, ідэнтыфікацыйны нумар, кім і калі был выдадзены дакумент, імя, імя па бацьку, прозвішча) і хатні паштовы адрас (індэкс, населены пункт, вуліца, дом). Гэтыя звесткі будуць патрэбны для бухгалтэрыі ў выпадку, калі «проба пяра» будзе надрукавана ў газеце. ТОЛЬКІ яны падаюцца аўтарам на БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовах. У выпадку, калі ў маладога ці юнага аўтара яшчэ няма пашпарта, вышэйназваныя звесткі падаюцца на аднаго з бацькоў, настаўніцу, кіраўніка гуртка (звесткі з пасведчання аб нараджэнні для бухгалтэрыі не падыходзяць).
10. Апроч таго, аўтар паведамляе СВОЙ нумар мабільнага або хатняга тэлефона, каб рэдакцыя ў выпадку неабходнасці магла аператыўна з ім звязацца.
11. Павінна быць пазначана поўная колькасць гадоў аўтара на момант адсылання конкурснай работы, нумар школы і класа.
12. Аўтар павінен паведаміць крыху дадатковай інфармацыі пра сябе (10—15 радкоў) у адвольнай форме. Напрыклад, якія і ў чым мае дасягненні (вучоба, спорт, мастацтва і г.д.), чым захапляецца ў вольны час, кім марыць стаць у будучыні і інш.
13. Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.
14. Пра канчатковую дату падвядзення вынікаў творчага конкурсу рэдакцыя паведаміць дадаткова. Адсочваць публікацыю «проб пяра» павінны самі юныя і маладыя аўтары або іх куратары (бацькі, настаўнікі, кіраўнікі гурткоў).

* * *

**Як бачыце, не змянілася назва конкурсу, умовы яго правядзення і падвядзення вынікаў. Але мы вельмі спадзяёмся (і ўпэўненыя ў гэтым!), што ў ім будзе і шмат новага: новых імёнаў таленавітых юных і маладых няштатных аўтараў, новых цікавых аўтарскіх матэрыялаў, новых тэм і нестандартных падыходаў у іх раскрыцці, вядома ж, новых герояў публікацый. Тых, хто малады і каму не ўсё роўна!**

**Ну што ж, напрыканцы наша заўсёднае: «вастрыце пёры», аўтары! Зычым усім творчых поспехаў і перамог! Як мы не стамляемся паўтараць, паверце, прайграўшых у конкурсе не будзе!**

**Куратары праекта**
**Надзея НІКАЛАЕВА і Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Дзе пануе цішыня*

# ШУКАЦЬ — ПА ШЫФРЫ, ПАЗНАЦЬ — ПА ВОКЛАДЦЫ

## Не згубіцца і не разгубіцца ў бібліятэцы



Фота Надзеі БУЖАН.

**Фонд Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта размешчаны ў трох карпусах у розных частках Мінска, а 8 абанементаў і 11 чытальных залаў не заўсёды знаходзяцца на адным паверсе. Калі студэнт адразу трапіў у патрэбны корпус, то са сховішча чакаць кнігу яму давядзецца каля 10—15 хвілін. Калі ж ён заказаў яе з іншага корпуса і сам не захацеў туды ісці, то патрэбны экзэмпляр можа да яго дабірацца цягам дня. Які ж шлях пераадольвае падручнік перад тым, як трапіць у рукі да чытача?**

— У нас цяпер захоўваецца два мільёны экзэмпляраў кніг — калі іх паставіць адзін на адзін, атрымаецца гара вышынёй у 500 кіламетраў і прыблізнай вагой у 133 афрыканскія сланы, — кажа **галоўны бібліятэкар аддзела маркетынгу і праектнай дзейнасці Вольга ВОЎК.** — Знайсці патрэбны падручнік у такой колькасці асобнікаў можа вопытны бібліятэкар, але не першакурснік. Работнікі, па магчымасці, стараюцца спрасціць студэнтам жыццё, аднак праблема часцей за ўсё не столькі ў складаным пошуку кнігі, а ў тым, што часта чытачы не ведаюць, як і дзе шукаць.

У пачатку кніга трапляе ў аддзел камплектавання і апрацоўкі. Звычайныя чытачы тут па калідорах не ходзяць, а ва ўнутраной структуры ёсць аддзелы, куды ўваход закрыты нават для бібліятэкара. Пры афармленні асобніка ў фонд у апісанне, у тым ліку, уваходзяць ключавыя словы на выпадак, калі студэнт не памятае нічога, акрамя асноўнай ідэі твора, які яму трэба ўзяць.

**Галоўнае правіла адкрытага доступу да фондаў чытальнай залы ў любой бібліятэцы — ніколі не кладзіце кніжкі назад на паліцы. Нават калі вы поўнасцю ўпэўнены, што запомнілі месца.**

У аддзеле рэдкай кнігі «на рукі» літаратуру не выдаюць. Наогул, да яе тут асаблівае стаўленне, некаторыя з кніг — сапраўдныя каштоўнасці. Таму чытаць іх дазваляецца з вялікай асцярожнасцю, а калі студэнту патрэбна раздрукоўка, то сканує старонку бібліятэкар. Пасля пажару, які здарыўся ў 1947 годзе, у бібліятэцы ўніверсітэта засталося толькі 4 тысячы кніг — яны на той момант былі «на руках» або ў чытальнай зале. Іншыя бібліятэкі Савецкага Саюза аказалі дапамогу кнігамі па прынцыпе «што магу, тое і даю», у тым ліку дарэвалюцыйнымі выданнямі. У СССР кнігі «царскіх часоў» асаблівай каштоўнасцю не былі, а вось сучасныя бібліяфілы лічаць іх рэдкасцю і ацэньваюць у тысячы долараў.

Вопытны бібліятэкар знойдзе кнігу нават па апісанні вокладкі, аднак стандартны запыт для выдачы падручніка — аўтар, назва, год выдання. «Вышэйшыя пілатаж» — гэта калі називаецца яшчэ і шыфр універсальнай дзесяцічнай класіфікацыі (УДК). Яго можна знайсці побач з назвай кнігі ў электронным каталозе бібліятэкі. Дарэчы, у ім жа можна даведацца, дзе знаходзіцца патрэбны асобнік і не марнаваць час пераездамі паміж карпусамі.

> **Дарэчы**
>
> **Электронны каталог, фонд кантрольных экзэмпляраў, рэпазіторый, база даных сусветных выдавецтваў ёсць не толькі ў БНТУ. Такія ж паслугі аказваюць студэнтам і бібліятэкі іншых універсітэтаў.**

Шыфр для бібліятэкара ўсё роўна, што назва вуліцы, нумар дома і кватэры для паштальёна. Ён дазваляе сарыентавацца сярод стэлажоў. Супрацоўнікі з вопытам жартуюць, што праз шыфр УДК можна спакойна ліставацца, бо ледзь не кожнае слова мае свой лікавы адпаведнік. Напрыклад, 51 — матэматыка, 511 — тэорыя лічбаў, 511.2 — алгебраічная тэорыя лічбаў. Галоўнае правіла адкрытага доступу да фондаў чытальнай залы ў любой бібліятэцы — ніколі не кладзіце кніжкі назад на паліцы. Нават калі вы поўнасцю ўпэўнены, што запомнілі месца. Бо вашая памылка на адну «кватэру» вымусіць бібліятэкара ўчыняць поўны «перапіс насельніцтва», а гэта — каля 6 тысяч кніг. Прачытаныя кнігі трэба класці на спецыяльныя стэлажы каля паліц, адкуль супрацоўнікі чытальнага зала расстаўяць іх на месцы.

**Пры афармленні асобніка ў фонд у апісанне, у тым ліку, уваходзяць ключавыя словы на выпадак, калі студэнт не памятае нічога, акрамя асноўнай ідэі твора, які яму трэба ўзяць.**

Сітуацыя, калі кніга патрэбна «тут і цяпер», але ні на абанеменце, ні ў чытальнай зале яе не было, падаецца безвыхаднай. Аднак выйсце заўсёды ёсць. Запоўніце заяву, і патрэбны падручнік літаральна падымецца «з глыбіняў» — прыедзе на маленечкім ліфце з падземнага кнігасховішча. Там захоўваецца фонд кантрольных экзэмпляраў усіх выданняў, якія толькі мае бібліятэка. Літаратура з яго рэдка пакідае свае паліцы, а ў памяшканні кнігасховішча пастаянна працуе сістэма клімат-кантролю з пэўнымі паказчыкамі тэмпературы і вільготнасці.

З папяровага ў электронны фармат кнігі пераводзяць у аддзеле электронных рэсурсаў. Рэпазіторый — гэта бібліятэка электронных выданняў. У БНТУ ён з'явіўся ў 2012 годзе: тут у PDF-фармаце захоўваюцца вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі, артыкулы з перыядычных выданняў, матэрыялы канферэнцый — работы, напісаныя выкладчыкамі ці студэнтамі БНТУ, а таксама навукоўцамі, якія апублікавалі іх ва ўніверсітэцкіх выданнях.

Карысць электроннай бібліятэкі відавочная: яна працуе кругласутачна. Калі якога-небудзь артыкула няма на рэсурсе, аўтар можа звярнуцца да бібліятэкара і папрасіць, каб яго работу перавялі ў электронны выгляд. Звычайна гэтай паслугай карыстаюцца выкладчыкі, калі кніга ўключана ў вучэбную праграму. Калі ж электронны варыянт дапаможніка тэрмінова патрэбны студэнту, ён можа звярнуцца ў службу электроннай дастаўкі дакументаў, пасля чаго бібліятэкары дашлюць на скрыню ў інтэрнэце копію тэкста памерам да 25 старонак. У еўрапейскіх універсітэтах такая паслуга каштуе 20-30 долараў, а студэнты БНТУ могуць карыстацца ёй бясплатна. Увогуле, на сайце рэпазіторыя тэксты размешчаны ў свабодным доступе, таму іх можа спампаваць на свой камп'ютар любы карыстальнік інтэрнэту.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*Свой інтарэс*

# Карысная «халява»

## Як студэнту адпачыць бясплатна?

**«Халява, прыйдзі!» — і дагэтуль часам па традыцыі крычаць з вокнаў інтэрнатаў студэнты напярэдадні сесіі, спадзеючыся на беспраблемную здачу залікаў і экзаменаў. Нават калі не вучылі ці вучылі мала... Цяпер гэта, мабыць, не вельмі дапамагае. Затое магчымасцяў правесці цікава вольны час, не патраціўшы пры гэтым ні капейкі, у студэнтаў, як аказалася, шмат.**

І першы памочнік у пошуках халявы — свая ВНУ. Прафкам і БРСМ на ўзроўні навучальнай установы распаўсюджваюць бясплатныя квіткі на канцэрты, у кіно, тэатры, абанементы ў басейн і трэнажорную залу (пры ўмове, што ты член арганізацыі). Канешне, робіцца гэта не кожны дзень, таму неабходна адсочваць інфармацыю праз суполкі ў сацсетках або звярнуцца напрамую да студэнтаў-актывістаў.

Гурткі і аб'яднанні па інтарэсах бываюць бясплатнымі не толькі ў школе і цэнтрах дзіцячай творчасці. Напрыклад, на базе інтэрнатаў Студэнцкага гарадка БДУ працуюць дзве танцавальныя студыі — «Шанц» і «Elysium». Ёсць і творчыя майстэрністудыі — «АРТГРУП» для тых, хто спрабуе свае сілы ў жывапісе, і «Клуб-ОК», дзе ўдзельнікі ствараюць вырабы з шэрсці, а таксама займаюцца інтуітыўным маляваннем. Акрамя настольнага тэніса, валейбола, баскетбола ў інтэрнатах прапануюць заняцца і папулярнымі сёння відамі фітнесу: аэробікай, ушу, ёгай, пілатэсам, стрэтчынгам.

Квэсты і гульні накшталт «Схваткі», якія сярод моладзі лічацца аднымі з самых цікавых спосабаў правесці час, пачалі праводзіць і ва ўніверсітэтах. Так, студэнцкі савет БДУІР арганізоўвае бясплатныя квэсты для першакурснікаў, трэба толькі загадзя зарэгістравацца — на лясны, гарадскі ці інтэлектуальны.

Лакальныя мерапрыемствы на факультэтах — яшчэ адзін варыянт. На журфаку БДУ кінаклуб «Фруза» ладзіць тэматычныя прагляды фільмаў за кубачкам чаю з цукеркамі (яны, дарэчы, таксама бясплатныя), на якія запрашаюць рэжысёраў, сцэнарыстаў і крытыкаў. Уваход на пасяджэнні кінаклуба вольны для ўсіх ахвотных.

Калі звярнуцца да інтэрнэту, то ў сацыяльных сетках знойдзеш дзясяткі спецыяльных суполак, дзе размяшчаюць інфармацыю пра адкрытыя разавыя заняткі ад камерцыйных школ і адукацыйных арганізацый. Прапаноў заўсёды шмат: і ўрокі па дзіджэінгу, і трэнінгі на тэму «Як натхніць мужчыну?»

— Я досыць часта хаджу на бясплатныя заняткі, сустрэчы са спікерамі. Не сакрэт, што амаль усе яны скіраваны на продаж чаго-небудзь (гэта значыць, там пастаянна гучыць рэклама), — кажа **Надзея КРАЎЧУК, студэнтка чацвёртага курса Інстытута журналістыкі БДУ.** — На такіх мерапрыемствах трэба быць гатовым «фільтраваць» тое, што чуеш. Толькі так можна вынесці карысную для сябе інфармацыю.

**Прафкам і БРСМ на ўзроўні навучальнай установы распаўсюджваюць бясплатныя квіткі на канцэрты, у кіно, тэатры, абанементы ў басейн і трэнажорную залу.**

Тое ж самае тычыцца і пробных бясплатных заняткаў у фітнес-клубах. Безумоўна, ніхто не навучыцца садзіцца на «шпагат» за гадзіну, затое з'явіцца зацікаўленасць і жаданне купіць абанемент на поўны курс.

Ёсць у Мінску і некамерцыйныя арганізацыі, якія ставяць перад сабой адзіную мэту — даць веды тым, хто не гатовы за іх плаціць. У маладзёжным адукацыйным цэнтры «Фіяльта» бясплатна вучаць праграмаванню, сахаджа ёзе, ладзяць сустрэчы з экспертамі ў розных прафесійных сферах і інш. Валанцёрская суполка «Мінск гаворыць» запрашае тых, хто цікавіцца замежнымі мовамі (англійскай, грэчаскай, іспанскай, італьянскай, партугальскай, французскай і інш.). Заняткі праходзяць на базе Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, іх вядуць не прафесійныя выкладчыкі, а апантаныя лінгвістыкай людзі.



Фота Яраслава ЛЫСКАЎЦА.

Хлопцы і дзяўчаты, што ўжо валодаюць замежнымі мовамі хаця б на базавым узроўні, могуць практыкаваць свае ўменні ў кінатэатры «Перамога» на бясплатных сеансах у рамках фестывальных паказаў (яны адбываюцца некалькі разоў на год).

— Тыдні кіно розных краін даюць магчымасць не толькі паглядзець фільмы на мове арыгінала, але і пазнаёміцца з аднадумцамі. Тут заўсёды шмат моладзі, — адзначае студэнтка трэцяга курса **Інстытута журналістыкі БДУ Меруерт КАЛДАСАВА,** якая прыехала вучыцца ў Беларусь з Казахстана. — Да таго ж прыемна здзіўляе рэпертуар кінатэатра: паказваюць фестывальныя карціны, якія не знойдзеш у сеціве і не пагледзіш па тэлебачанні.

Тыя студэнты, каму па душы выяўленчае мастацтва, могуць у Мінску бясплатна наведваць галерэі. Ва ўніверсітэце культуры выстаўляюцца працы студэнтаў, нядаўніх выпускнікоў БДУКіМ і іншых маладых творцаў. У Нацыянальнай бібліятэцы функцыянуе галерэйна-выставачны комплекс з мастацкімі творамі айчынных і замежных майстроў. Сюды пускаюць па чытацкім білеце (незарэгістраваныя наведвальнікі могуць узяць разавы пропуск у даведачным цэнтры бібліятэкі). Акрамя таго, галоўныя музеі сталіцы рэгулярна адчыняюць свае дзверы перад усімі ахвотнымі абсалютна бясплатна. Так, у Літаратурны музей Янкі Купалы можна схадзіць у апошні панядзелак месяца, у Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — у першы аўторак, музей гісторыі беларускага кіно — у апошні аўторак, літаратурны музей Петруся Броўкі — у першую сераду, у музей народнай архітэктуры і быту — у другую сераду, музей-майстэрню З.І. Азгура — у трэцюю сераду, нацыянальны мастацкі і нацыянальны гістарычны музеі — у апошнюю сераду, музей гісторыі тэатральнай і музычнай гісторыі Беларусі — у першую суботу, літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа — у апошнюю суботу. На аснове ўласнага вопыту раю ісці ў музеі ў першай палове дня, бо ўвечары ёсць верагоднасць туды не патрапіць з-за вялікага наплыву наведвальнікаў.

**Ганна КУРАК, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# СЛЕД НА СТО ГАДОЎ НАПЕРАД...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Кожнае лета лясніцтву традыцыйна дапамагаюць школьнікі. Для старшакласнікаў пасадка маладых елак і сосен залічваецца як практыка. Сёлета сітуацыя іншая: дапамогу прапаноўвалі нават добраахвотнікі, а ў канцы верасня распачаўся працоўны семестр у студэнтаў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

— На працу выязджаюць лесагаспадарчы факультэт і факультэт тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці, — кажа **старшы выкладчык кафедры лясных дарог і вывазкі драўніны, кандыдат тэхнічных навук Руслан КАРАЛЕНЯ.** — Сёння я курырую трэцякурснікаў. Садзіць лес будзем, як і нашы папярэднікі з другога курса, два тыдні, а ўсяго працоўны семестр працягваецца месяц.

**Удзел у пасадках стане вялікім бонусам пры засяленні ў інтэрнат на наступны год. Будзе і матэрыяльнае ўзнагароджанне.**

Дапамога лягасу ў час практыкі студэнтам не залічваецца, прапушчаныя тыдні вучобы давядзецца «наганяць». Затое ўдзел у пасадках стане вялікім бонусам пры засяленні ў інтэрнат на наступны год. Будзе і матэрыяльнае ўзнагароджанне, праўда, якое — пакуль невядома, усё залежыць ад выкананай працоўнай нормы.

...41 чалавек, хаваючы насы ў каўняры ад халоднай восеньскай вільгаці, надзяваюць пальчаткі і прыглядаюцца да дзялянкі. Сярод сарака пар ботаў і чаравікаў бачны боцікі з кветачкамі. Іх гаспадыня Ксенія Казлова сама нібы тая кветка: адзіная дзяўчына што ў сваёй групе на факультэце, што на гэтым этапе працоўнага семестра.

— На самай справе, у нас на курсе многа дзяўчат, гэта я абрала такі прафесійны ўхіл, што аказалася адзінай у групе з 17 чалавек. На трэцім курсе ўжо адчуваю сябе камфортна, а вось напачатку была паніка. Потым



Ляснік Мікалай Манулік (справа) назірае за правільнасцю пасадкі сасонак.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

прывыкла, ды і хлопцы аказаліся добрымі, кампанейскімі.

Вучыцца Ксенія прыехала з Камянецкага раёна і напачатку скіроўвала позірк на БНТУ, аднак спіс прафесій там падаўся занадта «мужчынскім». А вось спецыяльнасць «лесаінжынерная справа» на факультэце тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці БДТУ абяцала падрыхтоўку шырокага профілю, на якую дзяўчына і спакусілася. На лекцыях Ксенія вывучае ўсе этапы ляснога гаспадарання: ад пасадкі культур да тэхналогіі нарыхтоўкі спелага лесу і лесатранспартнай лагістыкі. Праўда, на скрыні з саджанцамі дзяўчына паглядае з хваляваннем: на практыцы ў Негарэльскім вучэбна-вопытным лягсасе яна трэніравалася па пракладцы дарог скрозь лес, а вось садзіць дрэўцы ёй яшчэ не даводзілася.

Пакуль студэнты прымяраюцца да мяча Колесава, ляснічы Валмянскага лясніцтва Міхаіл Шнітоўскі пачынае інструктаж па тэхніцы бяспекі, а потым — па тэхніцы пасадкі. На першы погляд, навука не хітрая: мячом у зямлі робіцца пасадачная лунка, туды апускаюцца карэньчыкі маладой сасны. Яшчэ адзін рух — і меч прыціскае зямлю да парастка, выдаўліваючы паветра з ямкі. Застаецца толькі прытаптаць.

— Нам пашанцавала з надвор'ем. Нядаўнія дажджы размачылі глебу, а гэта значыць, што саджанцы лепей прыжывуцца, — тлумачыць **майстар лесу Валмянскага лясніцтва Аляксандр КАЛЕНДА.** — Сённяшні аб'ём работ — дзялянка плошчай каля 2,5 гектара. Калі яе цалкам засадзіць, атрымаецца прыблізна 12 тысяч новых лясных культур. У восем радоў высаджваем сасну, але мяркуецца, што тут будзе расці і бяроза. У апошняй надзвычай хуткае натуральнае ўзнаўленне, яна насеецца сама, мы проста пакінем для яе па два пустыя рады. Садзіць будзем, пакуль не пачнуцца маразы, а потым працягнем вясной.



Падчас тэхналагічнага перапынку самы час перакусіць.

Аляксандр працуе ў лясной гаспадарцы пяць гадоў. Прафесію атрымліваў у Полацкім дзяржаўным лясным каледжы, а потым вярнуўся на радзіму ў Смалявічы. Са школьнікамі ездзіць на пасадкі тры гады. Студэнты ў якасці памочнікаў трапіліся яму ўпершыню...

— Асноўная праблема ўсіх навічкоў у справе — гэта дыстанцыя. Калі пасадзіць дрэўцы занадта блізка, то потым атрымаецца «маркоўнік»: кволыя тонкія парасткі, якім не хапае ні вады, ні карысных рэчываў. Эканамічна такі лес ні пад што не прыдатны. Нармальная адлегласць паміж саджанцамі павінна быць прыблізна на дзве ступні. Калі школьніку тлумачыш — быццам бы ўсё разумее, а праз пяць хвілін зноў збіваецца. Са студэнтамі ўсё ж працаваць, — гаворыць Аляксандр.

Будучыя інжынеры Уладзіслаў Юпашаў і Сяргей Карчэўскі хутка асвоіліся ў новай справе. Абодвум падабаецца лес, хаця самі хлопцы раслі ў горадзе.

— Я з Ашмянаў, — расказвае Сяргей, — а сябар прыехаў на вучобу са Слоніма. Лес садзім упершыню, занятак, асабліва для нашай спецыяльнасці, лічу карысным.

Бліжэй да тэхналагічнага перапынку побач з дзялянкай леснікі распалілі вогнішча — па плане з 12 да 13 гадзін у студэнтаў адпачынак. Напачатку маўклівыя хлопцы хутка адагрэліся: нехта рабіў сэлфі, нехта дзяліўся з сябрамі чаем з тэрмаса.

**Сярод сарака пар ботаў і чаравікаў бачны боцікі з кветачкамі. Іх гаспадыня Ксенія Казлова сама нібы тая кветка: адзіная дзяўчына на гэтым этапе працоўнага семестра.**

— Пасля перапынку зноў вернемся да працы. У тры гадзіны прыязджае аўтобус, ён спачатку павязе нас у кавярню, што ў вёсцы Заблоцце, — на абед, а потым адразу вяртаемся ў Мінск. Мы са студэнтамі параіліся і вырашылі, што так будзе прасцей, чым абедаць у гадзіну дня і губляць сорак хвілін на дарогу ў кожны бок, — патлумачыў распарадак Руслан Караленя.

...З шашы маладыя саджанцы на дзялянцы не разгледзець. Леснікі кажуць, што ў сасны першай групы ўзрост галоўнага выкарыстання наступае праз сто адзін год, так што там цяпер, можна сказаць, расце лес для людзей наступнага стагоддзя.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*
*Мінск — Смалявіцкі раён — Мінск.*



Пагрэцца ля вогнішча ў вільготнае надвор'е — што можа быць лепш!

*Свой выбар*

# Пачаць зарабляць раней за равеснікаў

## З якімі думкамі моладзь ідзе ў каледжы

**Нягледзячы на распаўсюджанае меркаванне, што без дыплома ВНУ сёння нікуды, моладзь ідзе вучыцца не толькі ва ўніверсітэты. Чым прываблівае сярэдняя спецыяльная адукацыя, расказваюць першакурснікі каледжаў Пінска.**

Сямнаццацігадовая **Ганна ВІКТАРОВІЧ** прызнаецца, што вельмі баялася «праляцець» і не патрапіць у спісы залічаных на бюджэтнае навучанне. Але ёй пашчасціла, і цяпер яна **першакурсніца медыцынскага каледжа.**

— Калі падавала дакументы, арыентавалася ў першую чаргу на тое, што Пінск знаходзіцца недалёка ад майго дома — я з Івацэвіцкага раёна. Акрамя таго, наколькі мне вядома, пасля заканчэння гэтага каледжа па размеркаванні накіроўваюць на працу толькі ў межах Брэсцкай вобласці, а мне не хочацца ехаць у іншую, — дзеліцца Ганна.

Наперадзе ў дзяўчыны амаль два гады вучобы, і пра будучыню яна пакуль разважаць не бярэцца, але дапускае, што ў хуткім часе зноў можа стаць абітурыенткай. «Калі не хопіць ведаў, якія даюць у каледжы, то можна будзе пасля пайсці вучыцца завочна і пры гэтым працаваць, не губляючы час».

**Насця БЕНЕДЗЯСЮК паступіла ў Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў.** Дзяўчына з васьмі гадоў была ўдзельніцай Кобрынскага цыркавога калектыву, часта выходзіла на сцэну падчас гарадскіх і раённых мерапрыемстваў, фестываляў і конкурсаў. Таму пасля школы ваганняў наконт выбару будучай прафесіі ў яе не было — Насця мэтанакіравана рыхтавалася да творчых іспытаў на спецыяльнасць «Народная творчасць (абрады і святы)».

— Галоўны плюс творчай прафесіі — яна заўсёды будзе прыносіць мне задавальненне, — выказвае сваё меркаванне дзяўчына. — Спадзяюся, што і падчас вучобы ў каледжы сумаваць не давядзецца.

**Стас НЕЎДАХ** у чэрвені скончыў установу прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў родным Лунінцы.

— Паколькі пасляваў я добра, мне прапанавалі працягнуць вучобу па спецыяльнасці. Быў выбар: застацца ў сваім горадзе ці паехаць у суседні Пінск. Абраў другі варыянт, бо тут больш магчымасцяў цікава бавіць вольны час. Змагу займацца лёгкай атлетыкай і хадзіць на секцыі па баскетболе і валейболе, — кажа ўжо **навучэнец Пінскага дзяржаўнага індустрыяльна-педагагічнага каледжа.**

Спецыяльнасць Стаса — «Тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці» — ёсць і ў іншых каледжах. Аднак хлопец прынцыпова не хацеў ехаць у вялікі горад. На яго думку, у абласныя цэнтры і сталіцу заўсёды імкнецца шмат людзей, гэта значыць, што паступіць нават у каледж там больш складана. А вучоба — паўсюдна аднолькавая.

Стас не выключае, што ў будучым паспрабуе паступіць ва ўніверсітэт. Пасля каледжа гэта зрабіць прасцей і трапляеш адразу на трэці курс. «Але ўсё залежыць ад рынку працы. Пакуль у выпускнікоў ВНУ значна больш шанцаў на працаўладкаванне і далейшае развіццё кар'еры», — выказаў думку хлопец.

Пінчанка **Ксенія ЛЮКЕВІЧ паступіла ў Пінскі каледж УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»** пасля дзявятага класа. Дзяўчына выбрала спецыяльнасць, звязаную з замежнымі мовамі.

— Я разумею, што чым раней пачну атрымліваць прафесію, тым хутчэй пайду працаваць і зарабляць грошы. Параўнайце: я ўжо ў 19 гадоў змагу сябе забяспечыць, у той час як мае аднакласнікі толькі ў 22 гады скончаць універсітэты, — разважае Ксенія.

**На гэтую ж спецыяльнасць паступіла Таццяна ШУКАЛА.** Дзяўчына скончыла Патапавіцкую базавую школу ў Іванаўскім раёне, у якой з задавальненнем хадзіла на ўрокі нямецкай мовы.

— Па словах майго настаўніка, у мяне ёсць здольнасці, я маю добрае вымаўленне. Спадзяюся, што тут змагу пашырыць свае веды і ўдасканаліць навыкі, якія ў мяне ўжо ёсць. Пасля выпуску змагу працаваць у школе або, як варыянт, перакладчыкам. Але да гэтага яшчэ далёка — наперадзе чатыры курсы вясёлага студэнцтва!

Пажадаем першакурснікам, каб у іх залікоўках стаяла толькі «выдатна»!

**Ганна КУРАК, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **РУП «СМТ №22»,** Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 41-72-95, тел./факс 41-80-30 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел.руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 01119 | Автомобиль VAZ 21074 (рег. знак 5399 ВТ), 2000 г.в. | 354,00 (3 540 000) | 17,70 (177 000) |
| 2 | 01121 | Автомобиль ВАЗ-21074 (рег. знак 8653 ВА), 2001 г.в. | 294,00 (2 940 000) | 14,70 (147 000) |
| 3 | 01122 | Автомобиль VAZ 21074 (рег. знак 8724 ВТ), 2001 г.в. | 354,00 (3 540 000) | 17,70 (177 000) |
| 4 | 01138 | Автомобиль GAZ-3302 (рег. знак АЕ 3412-2), 2006 г.в. | 3 168,00 (31 680 000) | 158,40 (1 584 000) |
| 5 | 01127 | Автомобиль ГАЗ 33073 (рег. знак 7886 ВТ), 1993 г.в. | 1 122,00 (11 220 000) | 56,10 (561 000) |
| 6 | 01067 | Автомобиль GAZ-52 (рег. знак ВА 9631) | 756,00 (7 560 000) | 37,80 (378 000) |
| 7 | 01016 | Автомобиль GAZ-5312 (рег. знак АА 9426-2) | 924,00 (9 240 000) | 46,20 (462 000) |
| 8 | 01005 | Автомобиль ЗИЛ 131 (рег. знак ВА 2045), 1977 г.в. | 2 028,00 (20 280 000) | 101,40 (1 014 000) |
| 9 | 01021 | Автомобиль ЗИЛ – 441510 (рег. знак 8989 ВТР), 1990 г.в. | 1 344,00 (13 440 000) | 67,20 (672 000) |
| 10 | 01140 | Автомобиль ЗИЛ 5301 ВЕ (рег. знак АА 4254-2), 2006 г.в. | 1 890,00 (18 900 000) | 94,50 (945 000) |
| 11 | 01001 | Автомобиль КАМАЗ 5410 (рег. знак 6804 ВТП), 1978 г.в. | 1 380,00 (13 800 000) | 69,00 (690 000) |
| 12 | 01012 | Автомобиль КРАЗ 255В (рег. знак 7111 ВТП), 1974 г.в. | 2 682,00 (26 820 000) | 680,70 (6 807 000) |
| 13 | 01137 | Автомобиль MAZ 544008-030-021 (рег. знак АЕ 5727-2), 2005 г.в. | 5 082,00 (50 820 000) | 254,10 (2 541 000) |
| 14 | 01143 | Автомобиль МАЗ 555102 220 (рег. знак АА 5814-2), 2006 г.в. | 4 368,00 (43 680 000) | 218,40 (2 184 000) |
| 15 | 01148 | Автомобиль МАЗ 6422 05-220 (рег. знак АА 7225-2), 2007 г.в. | 7 764,00 (77 640 000) | 388,20 (3 882 000) |
| 16 | 01157 | Автомобиль MAZ 6422A8 (рег. знак АЕ 2203-2), 2008 г.в. | 6 606,00 (66 060 000) | 330,30 (3 303 000) |
| 17 | 01090 | Автомобиль ММЗ-4502 (рег. знак 6707 ВТР), 1992 г.в. | 810,00 (8 100 000) | 40,50 (405 000) |
| 18 | 01503 | Полуприцеп MAZ 9758 030 (рег. знак А 3110 А-2), 2005 г.в. | 2 778,00 (27 780 000) | 138,90 (1 389 000) |
| 19 | 01507 | Полуприцеп МАЗ 938662 (рег. знак В 2156 А), 2006 г.в. | 1 842,00 (18 420 000) | 92,10 (921 000) |
| 20 | 01505 | Полуприцеп ОДАЗ 93571 (рег. знак 6983 ВМ), 1990 г.в. | 486,00 (4 860 000) | 24,30 (243 000) |
| 21 | 01511 | Полуприцеп MAZ 938662 (рег. знак А 0701 А-2), 2008 г.в. | 2 178,00 (21 780 000) | 108,90 (1 089 000) |
| 22 | 01043 | Автомобиль ГАЗ 3507 (рег. знак А 9425-2) | 1 170,00 (11 700 000) | 58,50 (585 000) |
| 23 | 01134 | Автомобиль ЗИЛ 131В1 (рег. знак ВА 9511), 1980 г.в. | 1 380,00 (13 800 000) | 69,00 (690 000) |
| 24 | 01078 | Автомобиль МЗКТ 74171 (рег.знак АЕ 1057-2), 2009 г.в. | 25 842,00 (258 420 000) | 1 292,10 (12 921 000) |
| 25 | 03324 | Бульдозер Б10 М0111-1В (рег. знак 50), 2006 г.в. | 7 380,00 (73 800 000) | 369,00 (3 690 000) |
| 26 | 03330 | Погрузчик с бортовым поворотом Амкодор 211 | 11 869,20 (118 692 000) | 593,46 (5 934 600) |
| 27 | 02151 | Транспортное устройство к башенному крану, 1984 г.в. | 3 360,00 (33 600 000) | 168,00 (1 680 000) |
| 28 | 02218 | Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в. | 167 916,00 (1 679 160 000) | 8 395,80 (83 958 000) |
| 29 | 02219 | Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в. | 188 916,00 (1 889 160 000) | 9 445,80 (94 458 000) |
| 30 | 02220 | Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в. | 230 832,00 (2 308 320 000) | 11 541,60 (115 416 000) |
| 31 | 02237 | Кран МТТ-16А, 1990 г.в. | 8 100,00 (81 000 000) | 405,00 (4 050 000) |
| 32 | 02409 | Подъемник мачтовый ПМГП-1500, 2010 г.в. | 22 680,00 (226 800 000) | 1 134,00 (11 340 000) |
| 33 | 02410 | Подъемник мачтовый ПМГП-1501, 2010 г.в. | 22 680,00 (226 800 000) | 1 134,00 (11 340 000) |
| 34 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170г/п 10т, 2008 г.в. | 720,00 (7 200 000) | 36,00 (360 000) |
| 35 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170г/п 5т, 2008 г.в. | 900,00 (9 000 000) | 45,00 (450 000) |
| 36 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ, 2008 г.в. | 9 480,00 (94 800 000) | 474,00 (4 740 000) |
| 37 | 01068 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АІ 0955-2), 2008 г.в. | 42 273,00 (422 730 000) | 2 113,65 (21 136 500) |
| 38 | 01066 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 2642-2), 2008 г.в. | 39 762,00 (397 620 000) | 1 988,10 (19 881 000) |
| 39 | 01070 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 7110-2), 2008 г.в. | 42 631,20 (426 312 000) | 2 131,56 (21 315 600) |
| 40 | 02408 | Автогидроподъемник АГП 30-4 (АВ 9583-2), 2009 г.в. | 43 645,50 (436 455 000) | 2 182,28 (21 822 750) |
| 41 | 02404 | Автокран КС-55727-7 МАЗ 6303А3 (АВ 5439-2), 2008 г.в. | 71 997,30 (719 973 000) | 3 599,87 (35 998 650) |
| 42 | 02406 | Автокран КС-55727-7 МАЗ 6303А3 (АВ 9479-2), 2009 г.в. | 88 821,90 (888 219 000) | 4 441,10 (44 410 950) |
| 43 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 (2224ВА-2), 2007 г.в. | 4 669,20 (46 692 000) | 233,46 (2 334 600) |
| 44 | 01141 | Автомобиль МАЗ 543203-220 (АА 5802-2), 2006 г.в. | 5 724,00 (57 240 000) | 286,20 (2 862 000) |
| 45 | 03326 | Бульдозер Б10М 0111 (8965ВМ), 2008 г.в. | 22 852,80 (228 528 000) | 1 142,64 (11 426 400) |
| 46 | 03325 | Бульдозер Б 10М 0111-1В (ВА-2 4815), 2006 г.в. | 22 852,80 (228 528 000) | 1 142,64 (11 426 400) |
| 47 | 03327 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (ВА 3434), 2007 г.в. | 11 232,00 (112 320 000) | 561,60 (5 616 000) |
| 48 | 03328 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (ВА 3457), 2006 г.в. | 55 810,80 (558 108 000) | 2 790,54 (27 905 400) |
| 49 | 03311 | Бурильно-крановая машина БМ-205Д на базе трактора МТЗ-82 (8956 ВМ), 2008 г.в. | 29 425,50 (294 255 000) | 1 471,28 (14 712 750) |
| 50 | 02217 | Кран башенный КБМ-401П, 2010 г.в. | 242 892,00 (2 428 920 000) | 12 144,60 (121 446 000) |
| 51 | 03329 | Погрузчик Амкодор 332С4-01 (8955 ВМ), 2008 г.в. | 14 835,60 (148 356 000) | 741,78 (7 417 800) |
| 52 | 03332 | Погрузчик Амкодор 342В (ВМ 9636), 2008 г.в. | 18 549,90 (185 499 000) | 927,50 (9 274 950) |
| 53 | 01506 | Полуприцеп МАЗ 938662 (А0634А-2), 2006 г.в. | 3 315,60 (33 156 000) | 165,78 (1 657 800) |
| 54 | 03534 | Установка копровая для забивки свай на базе Т-10МБ 21-21-0 ВА-2 67-46 | 160 920,00 (1 609 200 000) | 8 046,00 (80 460 000) |
| 55 | 03291 | Экскаватор ЭК-12 (ВА 8048), 2006 г.в. | 13 841,10 (138 411 000) | 692,06 (6 920 550) |
| 56 | 03288 | Экскаватор ЭК-12 (ВА-2 8015), 2005 г.в. | 12 798,00 (127 980 000) | 639,90 (6 399 000) |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон: +375292121501

**Предмет аукциона**

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел.руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 05105 | Станок сверлильный СМ-8П, 1993 г. | 320,50 (3 205 000) | 16,03 (160 300) |
| 2 | 05106 | Станок сверлильный СМ-8П 1993 г. | 320,50 (3 205 000) | 16,03 (160 300) |
| 3 | 05012 | Станок токарный 16-К-20, 1989 г. | 1 516,00 (15 160 000) | 75,80 (758 000) |
| 4 | 05162 | Стенд для испытания гидросистем КИ-4815 М, 1985 г. | 829,50 (8 295 000) | 41,48 (414 800) |
| 5 | 05041 | Стенд профилактический «Star 12F», 1989 г. | 1 305,50 (13 055 000) | 65,28 (652 800) |
| 6 | 05048 | Пресс Р-337, 1991 г. | 504,00 (5 040 000) | 25,20 (252 000) |
| 7 | 04003 | Компрессор «Индия» мод. С 06010, 1989 г. | 743,00 (7 430 000) | 37,15 (371 500) |
| 8 | 05163 | Полуавтомат сварочный Solaris MULTMIG-220, 2015 г. | 339,50 (3 395 000) | 16,98 (169 800) |
| 9 | 05078 | Станок сверлильный 2С-132, 1992 г. | 1 152,00 (11 520 000) | 57,60 (576 000) |
| 10 | 05079 | Станок заточной 3Е-642, 1992 г. | 1 291,50 (12 915 000) | 64,58 (645 800) |
| 11 | 05080 | Станок плоскошлифовальный 3Д-711, 1992 г. | 2 063,00 (20 630 000) | 103,15 (1 031 500) |
| 12 | 05081 | Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г. | 837,50 (8 375 000) | 41,88 (418 800) |
| 13 | 05082 | Станок радиально-сверлильный, 1991 г. | 1 818,00 (18 180 000) | 90,90 (909 000) |
| 14 | 05089 | Станок фрезерный 6Т-80Ш, 1992 г. | 2 767,00 (27 670 000) | 138,35 (1 383 500) |
| 15 | 05091 | Станок точильно-шлифовальный Т-400, 1992 г. | 574,50 (5 745 000) | 28,73 (287 300) |
| 16 | 05156 | Сварочный аппарат Jasic ARC-315, 2007 г. | 337,50 (3 375 000) | 16,88 (168 800) |
| 17 | 04002 | Установка компрессорная К-24М, 2007 г. | 293,50 (2 935 000) | 14,68 (146 800) |
| 18 | 05158 | Молот ковочный МА 4129А, 1991 г. | 1 937,00 (19 370 000) | 96,85 (968 500) |
| 19 | 00085 | Газоанализатор «Инфракар» 08.01.2009 г. | 297,50 (2 975 000) | 14,88 (148 800) |
| 20 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 296,50 (2 965 000) | 14,83 (148 300) |
| 21 | 40018 | Трансформатор ТСЗИ 380/36, 1993 г. | 65,00 (650 000) | 3,25 (32 500) |
| 22 | 41218 | Станок СМЖ-172 (ножницы для резки арматурной стали), 2006 г. | 992,50 (9 925 000) | 49,63 (496 300) |
| 23 | 05155 | Сварочный аппарат THMIG-200, 2007 г. | 250,50 (2 505 000) | 12,53 (125 300) |
| 24 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 682,50 (6 825 000) | 34,13 (341 300) |
| 25 | 41040 | Станок вертикально-сверлильный МН-18, 1996 г. | 821,00 (8 210 000) | 41,05 (410 500) |
| 26 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201, 1991 г. | 462,00 (4 620 000) | 23,10 (231 000) |
| 27 | 41244 | Установка компрессорная СБ 4/Ф-500, 1989 г. | 936,00 (9 360 000) | 46,80 (468 000) |
| 28 | 41039 | Станок правильно-отрезной И61-22, 1991 г. | 4 104,00 (41 040 000) | 205,20 (2 052 000) |
| 29 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 1 692,00 (16 920 000) | 84,60 (846 000) |
| 30 | 42022 | Полуавтомат дуговой сварки ПДГ-351, 2007 г. | 936,00 (9 360 000) | 46,80 (468 000) |
| 31 | 44170 | Станок деревообрабатывающий ФСШ-1А (К), 2005 г. | 2 130,00 (21 300 000) | 106,50 (1 065 000) |
| 32 | 44171 | Станок деревообрабатывающий ЦТ-10/5м, 2005 г. | 1 926,00 (19 260 000) | 96,30 (963 000) |
| 33 | 44092 | Станок рейсмусовый МП-9-1695, 1998 г. | 4 092,00 (40 920 000) | 204,60 (2 046 000) |
| 34 | 44174 | Станок ленточнопильный «ПЛП-Астра-ЕС», 2006 г. | 8 676,00 (86 760 000) | 433,80 (4 338 000) |
| 35 | 41229 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 376,00 (3 760 000) | 18,80 (188 000) |
| 36 | 41230 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 376,00 (3 760 000) | 18,80 (188 000) |
| 37 | 41231 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 376,00 (3 760 000) | 18,80 (188 000) |
| 38 | 44600 | Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г. | 275,50 (2 755 000) | 13,78 (137 800) |
| 39 | 44601 | Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г. | 275,50 (2 755 000) | 13,78 (137 800) |
| 40 | 44227 | Матрица С-640 с пневмопрессом, 2009 г. | 1 452,00 (14 520 000) | 72,60 (726 000) |
| 41 | 44087 | Станок деревообрабатывающий «Лучеса» УОДМ-1, 1992 г. | 690,00 (6 900 000) | 34,50 (345 000) |
| 42 | 44088 | Станок заточной ВШ-027 РЭ, 1992 г. | 425,00 (4 250 000) | 21,25 (212 500) |
| 43 | 41222 | Станок автоматический режущий Метеор-1, 2009 г. | 2 010,00 (20 100 000) | 100,50 (1 005 000) |
| 44 | 41223 | Станок пневматический фрезерный GALAXU-1, 2009 г. | 1 662,00 (16 620 000) | 83,10 (831 000) |
| 45 | 41224 | Станок автоматический фрезерный POLAR-IV, 2009 г. | 1 164,00 (11 640 000) | 58,20 (582 000) |
| 46 | 41225 | Станок для прессовки углов APEX, 1989 г. | 4 422,00 (44 220 000) | 221,10 (2 211 000) |
| 47 | 05010 | Станок вертикально-сверлильный МН-18н, 2009 г. | 513,00 (5 130 000) | 25,65 (256 500) |
| 48 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 3 030,00 (30 300 000) | 151,50 (1 515 000) |
| 49 | 41043 | Станок заточной ВШ-025, 1992 г. | 123,00 (1 230 000) | 6,15 (61 500) |
| 50 | 41602 | Стружкоотсос УВП-2000, 2005 г. | 275,50 (2 755 000) | 13,78 (137 800) |
| 51 | 44173 | Станок деревообрабатывающий комбинированный Д-400, 2005 г. | 3 004,00 (30 040 000) | 150,20 (1 502 000) |
| 52 | 41232 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 376,00 (3 760 000) | 18,80 (188 000) |
| 53 | 41226 | Двухголовочный сварочный станок DZW-500, 2009 г. | 9 528,00 (95 280 000) | 476,40 (4 764 000) |
| 54 | 44172 | Станок деревообрабатывающий круглопильный ДК-150, 2005 г. | 5 082,00 (50 820 000) | 254,10 (2 541 000) |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 13-00 до 14-00. Ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375336774509

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.
При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN — срок оплаты не более **30** (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.09.2016 г. (транспорт и спецтехника лоты №№ 1-36, оборудование), 25.08.2016 г. (транспорт и спецтехника лоты №№ 37-56)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона 10.11.2016 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал** | **в 12 ч. 00 мин. – оборудование; в 13 ч. 00 мин. – транспорт и спецтехника** |

**Дата и время окончания приема документов: 08.11.2016** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Контактные телефоны: Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.
Email: auction@cpo.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, обращенного в доход государства**

**ЛОТ №1:** Капитальное строение с инв. № 710/С–62063 – Гараж 41, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ПГСК «Пилот – 17 г. Бобруйска» (ул. Ковзана, 85) общ. пл. 25,4 кв. м, фундамент здания – кирпичный, стены – кирпичные, перекрытия – деревянные, кровля – биполикрин.
Сведения о земельном участке: на земельном участке с кадастровым номером 741000000010003508, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Ковзана, 85, предоставленном на праве постоянного пользования ПГСК «Пилот-17 г. Бобруйска» площадью 0,2520 га, назначение – земельный участок для строительства и обслуживания гаражей.

**Начальная цена продажи 3 780,00 рублей в денежных знаках образца 2009 г.**
или 37 800 000 рублей в денежных знаках образца 2000 г.
**Сумма задатка 378,00 рублей в денежных знаках образца 2009 г.**
или 3 780 000 рублей в денежных знаках образца 2000 г.

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 703, г. Минск, МФО 153001369 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 22 ноября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 21 ноября 2016 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен предоставить Организатору:
– заявление на участие в аукционе; – копию платежного документа о перечислении задатка; – паспорт; – индивидуальные предприниматели и юридические лица – резиденты Республики Беларусь — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; – юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утв. Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2-х участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.
**Дополнительную информацию можно получить по тел. (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25**

## ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ООО «Корунд», извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

Торги состоятся 4 ноября 2016 года в 14.00 в помещении экономического суда Брестской области по адресу: г. Брест, ул. В.Хоружей, д. 8.
Для участия в торгах необходимо подать до 01 ноября 2016 года заявку и перечислить на расчетный счет ООО «Корунд» р/с 3012500100017 в ОАО «Приорбанк», код 749, УНП 200228302 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.
С имуществом, выставляемом на торги, можно ознакомиться предварительно согласовав время по телефону +375333521040.
Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 1.

*Сведения об имуществе, выставляемом на торги*

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Вводн. распредел. электрощит ВРУ-1, инв. № 19 | 34,50 | 1,73 |
| 2 | Верстак слесарный, инв. № 16 | 43,90 | 2,20 |
| 3 | Видеомагнитофон Philips VR-397, инв. № 44 | 5,50 | 0,28 |
| 4 | Копир Xerox PE16e, инв. № 80 | 64,40 | 3,22 |
| 5 | Кульман «Ассистент – 125», инв. № 25 | 139,30 | 6,97 |
| 6 | МФУ лазерный Canon i-Sensys MF 4410, инв. № 97 | 110,00 | 5,50 |
| 7 | Набор корпусной мебели «Вежа», инв. № 54 | 115,00 | 5,75 |
| 8 | Насос-гидрофор МН 1300 INOX, 24 л, инв. № 92 | 100,90 | 5,05 |
| 9 | Пишущая машинка электрон. SQ-1050, инв. № 15 | 16,90 | 0,85 |
| 10 | Принтер EPSON Stylus Photo 1290, инв. № 68 | 48,80 | 2,44 |
| 11 | ПЭВМ «Пилот», инв. № 96 | 71,00 | 3,55 |
| 12 | ПЭВМ «Пилот», инв. № 98 | 71,00 | 3,55 |
| 13 | Сканер Hp ScanJet 3800, L1945 A, инв. № 88 | 35,00 | 1,75 |
| 14 | Сканер MUSTEK ScanEspress A3, инв. № 69 | 101,70 | 14,25 |
| 15 | Фильтр обратного осмоса для воды Ro5, инв. № 93 | 66,70 | 3,34 |
| 16 | Холодильник «Минск», инв. № 21 | 89,30 | 4,47 |
| 17 | Телефон-автоответчик «Panasonic-750», инв. № 12 | 4,90 | 0,25 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам.
Цены указаны без учета налога на добавленную стоимость.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.
Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.
Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.
С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел. +375333521040.

*Душа — у традыцыях*

# «ШКОРНІ» СВАІМІ РУКАМІ

**Алёна ВІХРАВА — лаўрэат маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Супрацоўніца Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея перамагла сярод праектаў сацыяльнай сферы з прапановай стварыць «школу юных шапавалаў» (шапавальства — гэта ўменне ўручную валяць валёнкі). Мы пагутарылі з аўтарам унікальнага праекта і даведаліся, як на Магілёўшчыне захоўваюць старажытнае майстэрства нашых продкаў.**



— Нацыянальныя традыцыі трэба берагчы. На жаль, цяпер для стварэння такой школы не хапае грошай. Але ў нашым гісторыка-этнаграфічным музеі не першы год працуе дзіцячы гурток «Катрушнік». Сёння ў ім займаюцца дзесяць дзетак. Самаму малодшаму ўсяго сем гадоў.

— Калісьці катрушнікаў можна было сустрэць ці не ў кожным доме. Сакрэты свайго рамяства яны трымалі ў таямніцы, перадаючы іх з пакалення ў пакаленне. У іх нават свая ўмоўная мова была. Напрыклад, іголку яны называлі «бадухай». Грошы — гэта «хоўбы», шапка — «катруха», валёнкі — «шкорні». Але з часам, каб іх нялёгкая праца не «загінула», таямнічую мову прыйшлося рассакрэчваць.

Кажуць, што шапавальства з'явілася на Дрыбіншчыне ў XIX стагоддзі. Па адной версіі, тагачасны ўладальнік маёнтка Дрыбін спадар Ціханавецкі паслаў сваіх сялян у Ніжагародскую вобласць для навучання старажытнаму рамяству. Па другой версіі, уладальнік маёнтка, каб павялічыць насельніцтва (месца было даволі неабжытае), запрасіў сюды ўсіх ахвотных. Сярод перасяленцаў былі і тыя, хто ўмеў працаваць з аўчынай. Зараз у нашым раёне жыве каля трыццаці майстроў-шапавалаў, самаму старэйшаму — 81 год.

— Рабіць валёнкі складана? — пацікавілася я ў Алёны.

— Вельмі. Спачатку трэба падрыхтаваць воўну. Вымыць яе, вычасаць, высушыць. У сярэднім на мужчынскія валёнкі ідзе паўтара кілаграма, на жаночыя — каля аднаго. Пасля робіцца аснова. Майстар рассцілае на стале або дошках мокрае палатно («плацік»). На ім выраўноўваецца воўна. Затым усё разам скручваецца ў трубку, і майстар пачынае катаць гэты кулёк. Воўна ўсаджваецца і робіцца больш цвёрдай. Далей вырабу надаецца звыклая нам форма валёнка. Для таго каб у сярэдзіне абутак не «зросся», унутр кладуць газету, альбо «душу» (так называюць кавалачак тугой воўны). Пасля будучыя валёнкі зноў скручваюць у рулон і катаюць. Гэты працэс называецца «снаванне». Зваленую аснову кладуць на рабрыстую дошку, паліваюць гарачай вадой і доўга труць. Затым выраб вываротваюць і запіхваюць унутр калодку для надання формы. Апошні этап — сушка ў печы і зразанне лішняй воўны. Валёнкі гатовы. Як бачыце, рамяство складанае, але справа таго вартая: у такім цёплым абутку і ў самую лютую сцюжу ногі не змерзнуць. І, паверце, насіцца ён будзе доўга-доўга.

— Упэўнена, што мясцовыя сувеніры ахвотна бяруць замежныя госці, бо для іх гэта экзотыка...

— Так, гэта сапраўдны хэнд-мэйд, які цэніцца зараз ва ўсім свеце. Нашы самабытныя шапкі і лялькі-абярэгі раскупліваюць на «ўра». У модніц асаблівым попытам карыстаюцца валёнкі з кветкамі, арнаментам, бісерам. Наш абутак не толькі прыгожы, цёплы, але і экалагічна чысты — пры яго вырабе не выкарыстоўваюцца ні хімікаты, ні кіслоты, толькі гарачая вада.

Дарэчы, не так даўно старажытная традыцыя шапавальства ў Дрыбінскім раёне атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі. Спадзяёмся, што наша рамяство ў хуткім часе ўключаць і ў спіс нематэрыяльнай сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

*Друкуецца ў «Маладосці»*

**«Вельмі шкада,**
**бязмежна шкада,**
**але разуменне таго,**
**што свет вакол цябе**
**можа змяніцца толькі**
**тады, калі зменішся сам,**
**прыходзіць з асабістым**
**вопытам.**
**Не ўспрымаецца**
**гэта праз тэорыю.**
**Але... можа, так і трэба?**
**Той не паднімаўся,**
**хто не спатыкаўся...» —**
**напісаў Валерый**
**Гапееў для «візітоўкі»**
**ў «Маладосць».**
**«Візітоўка» тая суправаджалася «ненапісанай аповесцю», якую тым не менш вельмі цікава чытаць.**



**Валерый ГАПЕЕЎ**

# УЦЁКІ

***Урывак з ненапісанага рамана***

— ЦІКАВАЕ ён напіша! Вершыкі свае пішы сам, а астатнія тэмы — тое, што я скажу! — крычаў рэдактар, калі Віктар Сакуцін, 48-гадовы карэспандэнт раённай газеты, паспрабаваў аспрэчыць рашучы пратэст рэдактара на прапанову адправіць яго, Сакуціна, у Карчаваху. Там учарашняй раніцай было знойдзена мёртвае цяля (ужо другое, а былі яшчэ ўкрадзеныя гусі, куры), на гэты раз — якая жудасць — з літаральна вырванай з цела нагой, і па ўсім раёне ўспыхнулі яшчэ мацней і трывожней, чым месяц таму, размовы пра «чупакабру».

Віктар моўчкі праглынуў крыўду з-за абразлівага «вершыкі» — рэдактар ніколі не хаваў свайго стаўлення да рознай літаратурнай дзейнасці і лічыў літаратурную старонку, якая выходзіла раз на два месяцы ў раёнцы, марнаваннем газетнай плошчы.

— Увесь раён толькі пра гэта гаворыць... — не здаваўся Віктар, але ад яго мармытання рэдактар яшчэ больш узвіўся:

— Калі дадуць з райвыканкама каманду пісаць — знойдзецца каму, спецыяліст мне тут вялікі аб'явіўся, не твая справа туды лезці! План нарыхтоўкі кармоў зрываецца, травы цвітуць — во пра што пісаць і гаварыць трэба, а не чуткі падаграваць! Зараз жа збірайся і едзь! У Навасёлках трацііны плана няма, трактарыста ўчора п'янага вывалаклі з кабіны. Едзь! Разбірайся і давай матэрыял! У нумар чарговы! Вадзіцеля да мяне пакліч.

РЭДАКТАР шпульнуў ручку, якую трымаў у руках, на стол, ды замоцна, — тая апынулася на падлозе, слізгануўшы па стальніцы.

Віктар мусіў выйсці з кабінета, ведаў: калі паляцелі ручкі на стол, казаць нешта ўжо марна. Зайшоў у кабінет, дзе зазвычай чакаў выклікаў вадзіцель, сказаў пра заданне.

Ехалі моўчкі. Вадзіцель паспрабаваў было пачаць гаворку, але Віктар адказваў аднаслоўна, і той замоўк. Ужо не першы раз у такіх паездках Віктар лавіў сябе на думцы, што яго часцей і часцей цягне ў больш-менш «зацішных» абставінах паспрабаваць зразумець: як жа так атрымалася? Чаму ён стаў такім, які ёсць цяпер?.. Хіба ж ён пра гэта некалі марыў? Да такога імкнуўся? Каб вось так на яго крычаў маладзейшы на дзясятак гадоў рэдактар, зневажаў, грэбліва ставіўся да яго справы жыцця — паэзіі?.. Чаму? Чаму нічога не збылося? Чаму не мара збылася, а нейкі бляклы яе цень: не стаў ён вядомым і славутым паэтам, а толькі выдаў за свае ж грошы адну кніжачку вершаў, і яго вядомасць як паэта не можа выйсці далей за межы раёна?

З чаго ж пачалося? Што ён рабіў не так? У чым хібіў?

... ПАСЛЯ сёмага класа Віктар пачуваў сябе самым лепшым вучнем у школе. Падмуркам гэтага былі не толькі пахвальныя граматы за кожны год навучання, пяцёркі па ўсіх прадметах за ўсе гады, першыя вершы і невялічкія заметкі аб жыцці школы, якія хай не вельмі часта, але ж друкавалі раённая і рэспубліканская піянерская газеты, але найбольш — адносіны настаўнікаў дый увогуле дарослых да яго. Было ў іх тое, што падказвала Віктару пра яго выключнасць. Найбольш выразна тое праявілася ў панядзелак пасля Вялікадня.

Хто ў такі дзень думаў пра ўрокі? Вучні цалкам справядліва разлічвалі на паблажлівасць настаўнікаў — тыя ж таксама людзі. І хоць некалькі настаўнікаў разам з дырэктарам дзяжурылі ў велікодную ноч ля царквы, праганяючы адтуль вучняў, усе разумелі, што гэта — неабходнасць выканання нейкага знешняга рытуалу, на якім настойвалі розныя вышэйшыя ўлады. А ў глыбіні душы і сам дырэктар, і настаўнікі чакалі велікоднай ночы і дня не менш за вучняў. Іх гульня ў хованкі вакол царквы стала неад'емнай часткай усяго вялікага атрыбуту святкавання Уваскрэсення Хрыста ў іх вёсцы.

ТУТ былі свае правілы, дзе быў суботні «інструктаж» вучняў класнымі кіраўнікамі: не дай Божа, нехта з вучняў пойдзе ў царкву. Быў чорны тоўсты сшытак у руках дырэктара, куды запісваліся прозвішчы тых, каго заўважалі ля царквы. І было галоўнае: дамоўленасць адных уцякаць і хавацца, другіх — лавіць і запісваць. І адно запісваць, бо не памятала школа выпадку, каб раптам нейкаму вучню няхай хоць бы пры якіх умовах згадалі аб яго бадзянні вакол царквы на Вялікдзень.

У апошнія гады ўзрасла колькасць «гульцоў» з абодвух бакоў: для моладзі то была першая цёплая ноч, у якую бацькі не чакалі сваіх дачок і сыноў дадому ў вызначаны час і не трывожыліся з-за іх адсутнасці да ранку. І калі раней хіба што адзін дырэктар «дзяжурыў» ля царквы ў такую ноч, дык цяпер у яго было даволі памагатых: кожная з жанчын — класных кіраўнікоў — лічыла сваім абавязкам пракантраляваць сваіх вучняў. Жанчыны-настаўніцы часцей і больш затрымліваліся ў самой царкве, і невядома адкуль на іх галовах з'яўляліся лёгкія шаўковыя хусцінкі, а пад раніцу ўся купка настаўніц збіралася вакол быццам бы нічыёй кашолкі, дзе ляжалі фарбаваныя ў цыбульным шалупінні яйкі, кавалкі белых булак і яшчэ нешта featured рознае. Праходзіў поп, пырскаючы вадой на такія ж кашолкі, кошыкі побач. Гэтая, настаўніцкая кашолка, за колькі гадоў займела разам з настаўніцамі сваё сталае месца ў царкве, і поп пад усеагульнае ўхваленне іншых вернікаў пачынаў «свяціць Пасху» менавіта ад яго. А што ж, трэба ўважыць настаўніц: цэлую ноч адбылі...

ТАМУ панядзелак пасля Вялікадня быў, па праўдзе, працягам існуючай не прагаворанай ніколі ўслых, але такой зразумелай усім дамоўленасці.

І калі іх класны кіраўнік, настаўнік матэматыкі Уладзімір Афанасьевіч раптам сказаў усім разгарнуць сшыткі на хатнім заданні, гэта здзівіла, абурыла, а потым і развесяліла — пасля таго як першая і другая правераныя парты атрымалі двойкі адразу ў сшыткі і дзённікі. А што, хіба не весела — усім класам атрымаць двойкі?

Класны набліжаўся да стала Віктара і Андрэя, яго суседа, ціхага троечніка. Віктар адчуваў нейкую халодную весялосць — у яго, як і ва ўсіх, не было выканана заданне. Уладзімір Афанасьевіч нават не стаў пытацца, чаму не выканаў заданне Андрэй, адразу рэзка, са злосцю нават, запатрабаваў:

— Дзённік давай!

Адным рухам, моцна націскаючы, паставіў двойку і свой кароткі, у адну літару роспіс, і ў наступны момант яго рука кранулася сшытка Віктара.

— Не зроблена...

Віктар пачуў не просты папрок у двух словах настаўніка, а абвінавачванне ў страшным, непапраўным, ганебным учынку. Уладзімір Афанасьевіч ужо ішоў далей, а Віктар ніяк яшчэ не мог усвядоміць, што адбылося. У яго не запатрабавалі дзённік, яму не паставілі такую магчымую — і першую за ўсе сем гадоў у школе — двойку ў дзённік! Віктар амаль фізічна адчуў, як стаў нечым асобным ад усяго класа, ад астатніх вучняў. Увесь клас атрымаў адзнакі, большасць, канешне ж, двойкі. Хлопцы дык усе. За выключэннем вось яго, Віктара.

У гэтым выключэнні было, безумоўна, добрае, што грэла самалюбства і давала магчымасць глядзець на сябе як на значную асобу — яго, такога разумнага і таленавітага, вылучаюць настаўнікі, яго паважаюць дарослыя людзі... Але гэта адначасова адасобівала яго ад кола аднакласнікаў, ён выпадаў з таго асяродку, дзе цаніліся розныя якасці, але не здольнасць да вучобы, не круглыя пяцёркі як праява здольнасці. Ну, вядома, цаніліся і веды, але ўменне гуляць у футбол было куды больш значным. Было яшчэ многае і для Віктара не зусім зразумелае. Па якіх такіх крытэрыях адзін рабіўся сапраўдным лідарам, другі — аўтарытэтным суддзёй? І гэта ацэнка, вызначэнне, абіранне і вылучэнне ніяк не супадала з афіцыйнымі вучнёўскімі заслугамі. Віктар, адчуваючы па ўзрастаючай сваю выключнасць з пункту гледжання здольнасці і паспяховасці, адначасова са здзіўленнем мусіў бачыць змяненне сваёй ролі ў калектыве не вучняў, а проста хлопчыкаў і дзяўчынак. Ён не мог тады адзначыць для сябе, што кожны з іх станавіўся асобай, набываў асаблівыя якасці, вучыўся бачыць і цаніць пэўныя рысы характару ў іншых. Ён пакуль цалкам давяраўся меркаванню дарослых, цешыў сябе іх ацэнкай, а што тычыцца аднакласнікаў, то сваю адасобленасць, што ўсё большала, ён тлумачыў простай зайздрасцю. Пакрысе кволая, асцярожная думка ўзмацнела, і, нарэшце, ён змог аднойчы смела прызнацца самому сабе: ён не проста самы паспяховы і здольны вучань, а ў сваім развіцці стаіць вышэй за ўсіх іншых. А што, хіба адносіны да яго настаўнікаў не казалі пра тое ж?

Ён як быццам паводзіў сябе гэтак жа, як і ў ранейшыя гады, але нешта ўсё ж змянілася ў ім — адна з аднакласніц, суседка Галіна, двойчы кінула ў яго едкае «Хвалько!» І, трэба заўважыць, сказана было тое ў сітуацыі вельмі ж дарэчнай.

І першы, і другі раз словы апяклі, як удар бацькоўскай папругі ў дзяцінстве. Віктар зрабіў выгляд, быццам не пачуў, у кожным разе не адказаў ні позіркам, ні рухам, ні словам на гэтыя абразлівыя кпіны. «Зайздросцяць» — ён чапляўся за такое тлумачэнне, як за выратавальны і надзейны востраў.

ПАСЛЯ сёмага класа яму, як выдатніку, можна было і не хадзіць у арганізаваны пры школе лагер працы і адпачынку. Але ён пайшоў, больш за тое — стаў заставацца нанач у школе, хоць да дома было ўсяго тры кіламетры.

Прычына была ў тым, што цяпер выразна кідалася ў вочы і яму, і аднакласнікам, і дарослым-настаўнікам: у дзяўчат пад сукенкамі ўжо смела выкругляліся наперад маладыя грудзі, ілбы хлопцаў густа засейвалі прышчыкі.

Першая сарамлівая пачуццёвасць пасялілася ў школе разам з трыццаццю школьнікамі з двух сёмых класаў, і ўжо на другі вечар яна кіравала паводзінамі, дыктавала ўмовы, вызначала прыярытэты. Нясмелая і кволая, яна тым не менш адчайна прабівалася ў душах ужо юнакоў і дзяўчат, хоць мусіла яшчэ маскіравацца пад залішнюю весялосць, знарочыстую грубасць, вясёлую дураслівую гарэзлівасць, дзе ўсё менш было сэнсу, а больш дотыкаў, стрэлаў вачэй, новых, не бачаных раней усмешак.

Які сэнс быць першым у вучобе і не мець поспеху ў дзяўчат?..

SEX-БАЛЯСЫ

# А КУМІРЫ ХТО?

**Сэрцы мільёнаў фанатаў і прыхільнікаў «зорнай» пары Брэд Піт — Анджаліна Джалі нядаўна былі разбіты паведамленнем аб скасаванні імі шлюбу. Эталонны сплаў мужчынскай і жаночай прыгажосці, таленту, сямейных узаемаадносін распаўся. Так лічылі пра іх быццам бы ідэальны саюз многія, але не ўсе. Не, не падумайце, мне ў меру падабаюцца акцёры Піт і Джалі, тое, што яны прынялі ў сваю сям'ю чужых дзетак, таксама заслугоўвае павагі. Але ў адносінах да ўжо былой «зорнай» пары я заўсёды прытрымліваўся трапнага, на мой погляд, жарту ўдзельнікаў Клуба вясёлых і знаходлівых: «Насамрэч Анджаліна Джалі і Брэд Піт — няшчасныя людзі. Падчас сексу ім няма каго ўявіць на месцы партнёра».**

Іншымі словамі, скасаванне шлюбу толькі пацвердзіла адну простую ісціну: акцёры такія ж звычайныя людзі, як і мы з вамі. Я, канешне, не пра талент. («Аднойчы спатыкнуўся аб ката і з размаху ўпаў «задняй кропкай» на гітару. І тут я зразумеў, як Стас Міхайлаў піша свае песні»). Гаворка пра звычайныя чалавечыя пачуцці, эмоцыі, нават недахопы, калі хочаце. Зазяючы для нас «зорным» святлом з экранаў кінатэатраў, у паўсядзённым жыцці знакамітасці гэтак жа сама, як і ўсе іншыя людзі, снедаюць, аплачваюць камунальныя паслугі, вырашаюць нейкія іншыя бытавыя праблемы. («Баярскі з характэрнай інтанацыяй крычыць па тэлефоне: «Это горводоканалья?» — Яму ў адказ нараспеў: «Нет, это санстанция, санстан-ци-я, сан-стан-ци-я-я-я...»).

**«Інфармацыя — гэта тое, што ад нас хаваюць. Усё астатняе — рэклама».**

Мы самі сабе ствараем куміраў. Прыгадайце, як разрываецца сэрца, калі герой таго ж Баярскага — Д'Артаньян — спяшаецца на сустрэчу з каханай Канстанцыяй у Біцюнскі манастыр? І не паспявае... Нядаўна глядзеў фільм зноў, дык на гэтым месцы проста выключыў тэлевізар... І што праз некаторы час робіць гэты юнацкі эталон закаханасці і адданасці? У наступнай частцы фільма герой-палюбоўнік з не меншай палкасцю крычыць ужо іншай: «Мадлен! Мадлен!» Таму што рыцар без страху і дакору — звычайны чалавек са сваімі слабасцямі... А некаторыя знакамітыя людзі могуць добраахвотна развітацца са статусам куміра па прычынах, толькі ім адным і вядомых. Як, да прыкладу, Рэнэ Зэльвегер. За што дзяўчаты палюбілі не паўнаватую, адзінокую і няўдачлівую гераіню ў першай частцы «Дзённікаў Брыджэс Джонс»? За тыя эмоцыі, што можна было пабачыць на твары Брыджыс, — радасць, здзіўленне, расчараванне. Гэта быў жывы чалавек. Пасля пластыкі актрысу нельга пазнаць, а яе «гумавая маска» цяпер нічога не адлюстроўвае. Не дзіва, што трэцюю частку «Дзённікаў» калі і абмяркоўвалі, дык выключна ў кантэксце апошняй акалічнасці. Чаму «зорка» так абышлася са сваім тварам і ў канчатковым выніку з прыхільнікамі, думаю, многія так і не зразумелі, нягледзячы на тлумачэнні самой Зельвегер. («Люблю перамены. Калі, напрыклад, пятніцу змяняе субота. Ці суботу — нядзеля. А да астатніх перамен стаўлюся з асцярожнасцю»).



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А бывае, што некаторыя асобы ў наш час самі сябе прызначаюць у «куміры». (Памятаеце словы галоўнага героя з мульціка «Падаў мінулагодні снег»? «Хто тут, да прыкладу, у цары крайні? Нікога?! Дык я першы буду!..») Апошнім часам на гэтай ніве «запальвае» Джыгурда. («Вядомы акцёр Мікіта Джыгурда ходзіць у заапарк не столькі на звяроў паглядзець, колькі сябе паказаць»). Нядаўна ён зноў (даўно ж нічога не «выкідваў») нагадаў пра сябе: пагаліў усю расліннасць на твары і сфатаграфаваўся ў дамашнім інтэр'еры амаль аголеным, дэманструючы яшчэ і шматлікія татуіроўкі на целе. Пахваліўся, што памаладзеў гадоў на дваццаць: «Я Джыгурду на пенсію адправіў, каб тварыць у любові, любові без правілаў». («Добра скроены, лоўка зляплены. Ну, проста выліты я ў маладосці», казаў герой усё таго ж мульціка «Падаў мінулагодні снег»). Ну, што скажаш? Сваю «хвіліну славы» заслужыў, заслужыў... Гэтак жа, як і вядомая амерыканская актрыса і фотамадэль Кім Кардаш'ян, якая пасля фотаздымкаў з акцэнтам на сваю знакамітую «пятую кропку» («Сакрэт прыгожых валасоў — вялікія грудзі») недаравальна «доўга» — падаецца, пару месяцаў — адсутнічала ў свецкай хроніцы. Нагадаю, гэтая асоба навучылася пераводзіць у звонкую манету ўсе скандалы з сабой, удзельнічаючы ў рэаліці-шоу і іншых рознага кшталту здымках. І тут такая магчымасць зноў заявіць пра сябе: рабаванне і боязь быць згвалтаванай у парыжскай гасцініцы. А што ж ахова «зоркі»? Не паспела выклікаць... Злыя языкі сцвярджаюць, што гэта «рабаванне» арганізавала сама «ахвяра». Што ж, увага заваявана, далей застаецца не забыцца на ёй яшчэ і падзарабіць. («Інфармацыя — гэта тое, што ад нас хаваюць. Усё астатняе — рэклама»).

Вось і Вера Брэжнева з гэтай нагоды ў чарговы раз з'явілася на вокладцы моднага часопіса ў ніжняй бялізне, пацвярджаючы свой статус сексі. («Як гаварыў загадчык адной кафедры: «Жонкі старэюць, а студэнткі трэцяга курса — ніколі»). Не, ніхто не аспрэчвае — паглядзець ёсць на што. («Ты што, у такім выглядзе хадзіла на дыскатэку?» — «Так». — «Апранайся і кладзіся спаць!»). Але па частаце друкавання гэтых здымкаў спявачка хутка рызыкуе наблізіцца па колькасці згадванняў да «дарагога Леаніда Ільіча», прозвішча якога яна ператварыла ў сцэнічны псеўданім. А там і да анекдотаў, глядзіш, недоўга. Можа, усё ж слушна кажуць: не ствары сабе куміра?..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Спяваю для душы́. Але не ў ду́шы!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 8-й стар. «ЧЗ».)*

***— Адкуль такое веданне беларускай мовы, любоў да яе?***

— Я па адукацыі журналіст. У школе да мовы ставілася вельмі прыхільна, а на факультэце журналістыкі БДУ значная частка дысцыплін выкладалася па-беларуску, нават тыя, якія не звязаны з мовай. І я атрымлівала сапраўдную асалоду ад таго, як на ёй размаўляюць выкладчыкі, ад яе мілагучнасці. На жаль, у штодзённым жыцці ў мяне не атрымліваецца размаўляць па-беларуску, але на рэпетыцыях заўжды карыстаюся роднай мовай. Мяне нават аб гэтым просяць...

**«У нас, беларусаў, ёсць дзіўная рыса: мы не можам паслухаць нешта новае — яго абавязкова трэба адразу з чымсьці параўнаць».**

Беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці сапраўды не хапае. Не толькі мне, але і ўсім нам. І я вырашыла выправіць гэты недахоп творчасцю. Калісьці паспрабавала напісаць песню па-беларуску і ўжо не змагла спыніцца. Так я прыйшла да мовы і любові да яе. Увогуле людзі вельмі станоўча ставяцца да твораў па-беларуску. Нядаўна напісаў мужчына з Архангельска, які сам з Беларусі, але жыве ў Расіі, што «вашы песні вяртаюць мяне на Радзіму».

***— Калі анансаваліся адны з вашых першых песень, ты прапанавала слухачам шукаць не пэўны сэнс у трэках, а, хутчэй, настрой...***

— Калі мы ствараем музыку, то не думаем пра тое, што ў нейкім радку схаваны глыбінны сэнс. Людзі задумваюцца пасля праслухоўвання таму, што іх кранула музыка ў спалучэнні са словамі. І ў гэтым спалучэнні і ёсць сэнс. Калі ён гарманічны, то выклікае настрой, які адкладаецца ў душы. І гэта выклікае думкі. Гэта галоўнае. Я не лічу сябе паэтам і мае творы далёкія ад ідэалу, але я музыка, які стварае музыку і тэкст да яе. Ёсць два розныя паняцці: паэт і паэт-песеннік. Я сябе адношу да другой катэгорыі.

**«Усе кажуць, што сучаснае пакаленне не чытае. Але гэта не так. Мы чытаем іншае. Чытаем болей, але не мастацкую літаратуру, а цытаты і навіны ў сацыяльных сетках».**

***— Апошняя кампазіцыя «Людзі, дзе вы?» вельмі хутка разляцелася на сеціве. Як думаеш, у чым сакрэт?***

— Кажуць, што ў музыцы нельга зрабіць нешта на заказ. Гэта будзе не ад душы і не так прыгожа, як зробленае ў парыве. Песня была напісана толькі таму, што так было трэба. І для мяне стала шокам тое, што яна атрымалася ўдалай. Каб узяць удзел у конкурсе «Заспявай», трэба было пакласці верш сучаснага паэта на музыку і выканаць кампазіцыю. Сяджу я вечарам, гартаю старонкі ў інтэрнэце з рыфмаванымі радкамі і раптам трапляю на «Смутак горада» Ірыны Багдановіч. Прачытала — і музыка нарадзілася адразу. Мы звязаліся з паэткай: наша клавішніца Вераніка якраз вучыцца на філалагічным факультэце, дзе Ірына Багдановіч працуе. Яна была не супраць стварэння песні, хаця заўважыла, што рок ёй не зусім даспадобы. Калі даслалі канчатковы варыянт, адказу не атрымалі. Тым не менш, трэк запісаны, ужо ў ратацыі на радыё.

***— Дзіўна, калі маладая і занятая дзяўчына чытае беларускую літаратуру...***

— На самай справе на гэта зараз не заўжды хапае часу. Праца, курсы мовы, сям'я, сябры. Усе кажуць, што сучаснае пакаленне не чытае. Але гэта не так. Мы чытаем іншае. Чытаем болей, але не мастацкую літаратуру, а цытаты і навіны ў сацыяльных сетках. Да ўсяго трэба дарасці. І да якаснай літаратуры таксама. Больш




за ўсё мне падабаецца беларуская літаратура мінулага і гэтага стагоддзяў. Напрыклад, «Любіць ноч права пацукоў» Юрыя Станкевіча. Таксама даспадобы Сяргей Даўлатаў, Антон Чэхаў, Мікалай Гогаль, Агата Крысці, Уладзімір Караткевіч. Янка Купала мне больш блізкі, чым Якуб Колас.

***— Можаш вызначыць, у якім стылі працуеш?***

— Мы не ставім сабе ніякіх абмежаванняў. Робім тое, што падабаецца. Але акрэсліваем стыль як поп-рок. «Поп» — ад слова «папулярны». У большасці нашы песні блізкія да гэтага азначэння, а не да андэграўнда. А «рок», бо карыстаемся яго элементамі. Але ў трэках можна адшукаць і фолк, і блюз.

***— Ці ёсць ідэал, на які арыентуешся?***

— У нас, беларусаў, ёсць дзіўная рыса: мы не можам паслухаць нешта новае — яго абавязкова трэба адразу з чымсьці параўнаць. Тэрмінова патрэбна адшукаць аналаг у Расіі ці на Захадзе. Сама я слухаю разнастайную музыку і не спыняюся на адным напрамку. Нават рэп можа быць якасна выкананы і кранаць да слёз. Падабаецца «Rel1kt «, тое, што робіў Алесь Кот-Зайцаў у гурце «Босае сонца», «Серебряная свадьба». Досыць прафесійна працуюць «Nizkiz», «Мутнае вока», хаця аналагічную музыку не слухаю. Некаторыя кажуць, што я падобная да Adele па энергетыцы, стылі, па невербальных рысах. Станоўча стаўлюся да «Океан Эльзи». Мне б хацелася гучаць, як яны.

**«На жаль, у штодзённым жыцці ў мяне не атрымліваецца размаўляць па-беларуску, але на рэпетыцыях заўжды карыстаюся роднай мовай. Мяне нават аб гэтым просяць...»**

***— Як рэагуюць слухачы на вашы трэкі?***

— У большасці ім падабаецца наша музыка. Але не ўсім. Калі атрымалі «Адкрыццё года», то адзін хлопец напісаў: «Вы што, з глузду з'ехалі, даваць прэмію «цёлцы» ў скураных штанах?» Менавіта ў іх я выступала. Але ў гэтым каментары няма ні слова пра нашу музыку ці тэксты, толькі пра мой знешні выгляд. Мы і зараз, смеючыся, згадваем гэта, калі я апранаю тыя штаны... Але абсалютная большасць водгукаў і ад слухачоў, і ад рэжысёраў станоўчая.

***— Іх, напэўна, здзіўляе якасны вакал...***

— Магчыма *(усміхаецца)*. Часам мне падаецца, што зараз модна не трапляць у ноты. Здзіўляюся, калі члены журы прыходзяць у захапленне ад таго, як выканаўца экспрэсіўна пракрычаў тэкст. Гэта нешта новае раптам становіцца мэйнстрымам. Быць адукаваным музыкантам — не так ужо важна. Быць фрыкам — тое, што трэба.

***— Што цябе натхняе пісаць?***

— Нават магу дакладна згадаць, як нараджаліся пэўныя тэксты. «Маё мора» — калі была ў Паланзе на Балтыцы. Сядзела каля мора, а там было так холадна, глядзела ўдалечыню і раптам з'явіліся гэтыя радкі. Музыка прыйшла пазней — ужо ў Мінску. Песня «Навошта» нарадзілася ў той момант, калі я разыходзілася са сваім маладым чалавекам, несла цяжкія рэчы ў руках, і па дарозе дадому з'явіліся першыя чатыры радкі. Але часцей за ўсё вершы прыходзяць у ванным пакоі. Але я не спяваю ў душы! *(Смяецца)*. Напэўна, радкі пасылаюцца мне аднекуль з космасу.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

*pustavit@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.10.2016 г.

■ КІНО Д'АР

## Заза УРУШАДЗЭ: «КІНО — ГЭТА ЧАРАДЗЕЙНАЯ РЭЧ, ЯКАЯ ДАЕ МАГЧЫМАСЦЬ АЖЫВІЦЬ НАШЫ СНЫ»



**«Мандарыны» сталі першым грузінскім фільмам, намінаваным на Оскар, — у 2015 годзе ён прэтэндаваў на статуэтку ў катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». На кароткім спісе намінантаў, можна сказаць, канцэнтруецца ўвесь свет (тады ўзнагарода адышла польскай карціне «Іда» Паўла Паўлікоўскі), таму гарачая тэма канфліктаў паміж Грузіяй і Абхазіяй, адпаведна Грузіяй і Паўднёвай Асетыяй, дзякуючы мастацтву кіно, аказалася ў цэнтры ўвагі. Сюжэт фільма развіваецца ў абхазскім сяле эстонскіх перасяленцаў падчас вайны 1992 года. Карціна здымалася ў капрадукцыі з Эстоніяй, але аўтарам сцэнарыя і рэжысёрам стаў Заза Урушадзэ — вядомая фігура ў грузінскім кіно. Тут любяць тое, што ён здымае, — фільмы «Тры дамы», «Апякун» і, канешне, «Мандарыны». Рэжысёр таксама быў адным са стваральнікаў Нацыянальнага кінацэнтра, які фінансуе кіно. Сёлета Заза Урушадзэ будзе старшынёй журы асноўнага конкурсу кінафестывалю «Лістапад», што стала нагодай задаць яму некалькі пытанняў.**

***— Героі вашых фільмаў часта аказваюцца перад выбарам — у экзістэнцыяльнай, так званай «памежнай сітуацыі», якая вызначае развіццё персанажа і накіроўвае сюжэт. Адзін эпізод, размова, момант — і ўсё ўжо інакш; чалавек, дыспазіцыя і адносіны змяніліся. Як драматургічны элемент у кіно, рэальнасць якога існуе па сваіх законах, гэта добра спрацоўвае. Па вашых назіраннях, ці здольны «памежныя сітуацыі» вызначаць чалавека, накіроўваць ход падзей у рэальным жыцці?***

— Безумоўна, яны здараюцца і ўздзейнічаюць на чалавека, толькі ў жыцці мы гэты пераломны момант не заўважаем, дакладней, можа быць, вельмі рэдка разумеем яго наступствы. А падчас стварэння кіно на гэтым можна зрабіць фокус.

***— Ці можна сказаць, што вайна ў Абхазіі ў смутны час пасля распаду Савецкага Саюза, а тым больш узброены канфлікт 2008 года сталі для Грузіі такой жа «памежнай сітуацыяй»? Тады як яны паўплывалі на ход падзей? Гэта пытанне да вас хутчэй як да грамадзяніна.***

— У нашай гісторыі было шмат такіх момантаў, пакуль магу толькі сказаць, што мы фактычна страцілі дваццаць працэнтаў тэрыторыі, а мая краіна і так вельмі маленькая. Толькі гэта хачу сказаць у дадзены момант.

***— У вашых карцінах ідзе гаворка пра канфлікт у Абхазіі, згадваюцца Карабахскі канфлікт і Балканскі крызіс. На ваш погляд, якую функцыю выконвае мастацтва, у прыватнасці кіно, у складаных палітычных сітуацыях, ці здольна яно паспрыяць вырашэнню праблем?***

— Думаю, кіно, на жаль, не здольна спыніць канфлікты. Але мастацтва вельмі моцна ўздзейнічае на чалавека, асабліва кіно як яго самы папулярны від. І калі мець на ўвазе добрае кіно, а не прапагандысцкае, таму што прапагандысцкія фільмы маюць мала шанцаў быць добрымі (маю на ўвазе, калі яны такімі задуманыя), то ёсць шанс, што людзі, якія прымаюць важныя рашэнні, пасля прагляду фільма крыху задумаюцца над сваімі намерамі.

**«Для Апекуна сапраўды быццам няма месца ў новай Грузіі, але ён вельмі чалавечны, нягледзячы на сваю біяграфію. Ён стаў ахвярай абставін, дакладней, ахвярай цяжкага часу».**

***— У фільме «Тры дамы» тры часткі і адпаведна тры эпохі, якія звязвае адзін элемент — карціна. Адэкватную ацэнку ёй даў толькі персанаж з апошняга эпізоду, калі сказаў «Гэта што за хрэнь?» Якім сэнсам або сімвалам вы як сцэнарыст і рэжысёр надзялілі палатно?***

— Я не хацеў, каб яна была класічнай, стандартнай, добрай карцінай. На ёй адлюстраваны дзве савы — бацька і, па-мойму, сын. Я бачу, як бацька-сава любіць і абараняе маленькага сына-саву. Ад гэтага малюнка ідзе нейкі спакой і сіла любові.

***— Мне падаецца відавочнай аўтарская сімпатыя да галоўнага героя фільма «Апякун» — бандыта пачатку 1990-х Гогліка, які праз шаснаццаць гадоў выходзіць з турмы. Зыходзячы з сюжэта карціны, яму не знайшлося месца ў сучаснай Грузіі. Гэта значыць, Гогліка можна ўспрымаць як увасабленне таго, чаму не месца ў новай краіне. Што ён у такім выпадку ўвасабляе?***

— Ведаеце, я заўсёды адчуваю сімпатыю да сваіх галоўных герояў. Што тычыцца Апекуна, для яго сапраўды быццам няма месца ў новай Грузіі, але ён вельмі чалавечны, нягледзячы на сваю біяграфію. Ён стаў ахвярай абставін, дакладней, цяжкага часу, прадстаўніком так званага «страчанага пакалення», але мне ён падаецца больш сімпатычным, чым пластмасавыя новыя грузіны.

***— Што вы маеце на ўвазе, кажучы пра пластмасавых грузін?***

— Я кажу пра персанажаў майго фільма. Галоўнаму герою быццам не месца ў сучасным жыцці і ён быццам прадстаўнік страчанага пакалення, але мае сімпатыі аддадзены ўсё ж такі яму, таму што ён увасабляе больш чалавечых каштоўнасцяў, чым «правільныя» сучасныя героі.

***— Вы знялі карціну «Мандарыны» пра падзеі 1992 года праз пяць гадоў пасля чарговага вострага канфлікту паміж Грузіяй і Абхазіяй. Змаглі б вы стварыць такі ж «прымірэнчы» фільм у тым жа 2008 ці 2009 годзе? Магчыма, эмоцыі ў той час былі занадта моцнымі, каб працаваць з гэтай тэмай.***

— Час не мае значэння, галоўнае, як ты бачыш свет. Безумоўна, эмоцыі тады былі моцнымі, але ўсё ж такі я веру (хачу верыць), што зняў бы тады падобную карціну з тым жа пасылам.

***— Менавіта ваша работа стала першым грузінскім фільмам (хай і знятым у капрадукцыі), намінаваным на Оскар. Калі вы паехалі ў Лос-Анджэлес на цырымонію ўзнагароджання, колькі віна выпілі?***

— Як ні дзіўна для грузіна, я не люблю віно, у Лос-Анджэлесе мы выпілі крышачку каньяку.

***— Як мне ўяўляецца, сучаснае грузінскае кіно, калі можна так выказацца, сябе захавала. Гэта ўнікальнае аблічча, пошук уласнага стылю і мовы, глыбокі погляд на ўнутраныя працэсы... А што вы можаце сказаць пра сучаснае грузінскае кіно? Ці спрацаваў феномен, адпаведна якому мастацтва ў крызісных сітуацыях атрымлівае пэўны штуршок?***

— Я не ведаю, ці атрымлівае мастацтва штуршок у крызісных сітуацыях, але факт, што ў грузінскага кіно адкрылася другое дыханне. У нас ствараюцца вельмі цікавыя новыя фільмы — гэта работы Левана Кагуашвілі, Георгія Авашвілі, Наны Эквцімішвілі, Русудана Чканія, Цінацін Кайрышвілі, Нуцы Месхішвілі, Русудана Глурыдзэ. Хачу адзначыць, што без мінулага няма сучаснасці: новае грузінскае кіно заснавана на вельмі таленавітай глебе, толькі ў сучасных грузінскіх аўтараў свой почырк.

***— У Беларусі кіно з дзяржаўнага бюджэту фінансуецца з дапамогай конкурсу, які арганізуе Міністэрства культуры. Як удзельнік стварэння Нацыянальнага кінацэнтра ў Грузіі, раскажыце, у чым заключаюцца яго функцыі і які механізм тут выкарыстоўваецца для фінансавання кіно?***

— Кожны год Нацыянальны кінацэнтр абвяшчае конкурс кінапраектаў, а спецыяльная прафесійная экспертная камісія выяўляе пераможцаў. Кожны раз кінакамісія, якая прымае рашэнні, мяняе свой склад. Мне не вельмі падабаюцца аднаразовыя камісіі, але думаю, яны працуюць адкрыта. Кінацэнтр фінансуе максімум 75 працэнтаў бюджэту фільма. Праблема толькі ў тым, што ў яго мала грошай, таму наша ратаванне — у капрадукцыі, сумеснай вытворчасці.

***— З вышыні свайго досведу і прафесіяналізму скажыце, што такое мастацтва кіно?***

— Кіно — гэта чарадзейная рэч, якая дае магчымасць ажывіць нашы сны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*



Лембіт Ульфсак у «Мандарынах».

■ Падзея

# ГАЛОЎНЫ ГЕРОЙ — ПЕРШАДРУКАР

## Падведзены вынікі конкурсу п'ес «Францыск Скарына і сучаснасць»

**Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Налета ў нашай краіне будзе шырока адзначацца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. І ўжо сёння ідзе актыўная падрыхтоўка да гэтага маштабнага свята.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Пераможцы конкурсу «Францыск Скарына і сучаснасць» Сяргей КАВАЛЁЎ, Цімафей ІЛЬЕЎСКІ, Мікалай РУДКОЎСКІ.

— Калі абмяркоўвалі папярэдні план мерапрыемстваў, то падумалі, што толькі класічных бібліятэчных, навуковых сустрэч, канферэнцый для свята будзе недастаткова. Нават сумнавата, — кажа **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук Раман МАТУЛЬСКІ.** — Францыск Скарына — велізарная постаць, амаль святы. Але разам з тым гэта і звычайны чалавек, які жыў на нашай зямлі, вучыўся, працаваў, ведаў ласку лёсу, перажываў гора. Чаму ён пачаў друкаваць кнігі? Чаму стаў Скарынам? Чым ён жыў? З навуковага пункту гледжання адказаць на гэтыя пытанні вельмі цяжка. Але праз мастацтва, вобразы, творчую думку пісьменнікі, драматургі могуць даць свае адказы.

Так узнікла ідэя конкурсу. Яго арганізатарамі сталі Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Нацыянальная бібліятэка, фінансавую падтрымку аказаў Беларусбанк. П'есы і сцэнічныя ідэі, прадстаўленыя на конкурс, не толькі расказваюць пра факты жыцця нашага выдатнага суайчынніка, але і падкрэсліваюць значнасць яго постаці ў кантэксце сучаснасці. Арганізатары атрымалі творы аўтараў з Мінска, Полацка, Брэста, Гомеля, Маладзечна, Віцебска, Докшыц, Масквы, Кіева і іншых гарадоў. Да ўдзелу ў творчым спаборніцтве было прадстаўлена 32 заяўкі ў намінацыях «Гістарычная п'еса», «Сучасная п'еса», «Сцэнічная ідэя».

Пераможцаў вызначыла кампетэнтнае журы на чале з мастацкім кіраўніком тэатра беларускай драматургіі, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі Аляксандрам Гарцуевым. Так, найлепшай гістарычнай п'есай названы твор «Францыск Скарына. Прыпавесць» драматурга і рэжысёра з Брэста Цімафея Ільеўскага, у намінацыі «Сучасная п'еса» перамогу атрымаў Мікалай Рудкоўскі з Мінска і яго твор «Доктар свабодных навук», а ў намінацыі «Сцэнічная ідэя» адзначаны мінчанін Сяргей Кавалёў за п'есу «Юдзіф». Уладальнікамі дыпломаў І ступені сталі Сяргей Шыдлоўскі, Арына Андрэева, Міхаіл Туруноўскі, Віктар Марціновіч, а дыплом ІІ ступені атрымала Алена Іванюшанка.

Падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання **дырэктар тэатра беларускай драматургіі Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ** заазначыў:

— Я спадзяюся, гісторыя атрымае працяг, гэтыя творы пачнуць сваё жыццё на сцэнічных пляцоўках Беларусі. Ведаю, што адна з п'ес будзе ставіцца ў магілёўскім тэатры, спадзяюся, пастаноўкі, прысвечаныя Скарыну, прадставяць і на сцэне ў Брэсце. А Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі парадуе гледачоў новым спектаклем ужо ў гэтым тэатральным сезоне.

